Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

Факультэт мастацкай культуры
Кафедра рэжысуры

| | |
|---|---|
| УЗГОДНЕНА | УЗГОДНЕНА |
| Загадчык кафедры | Дэкан факультэта |
| ______________ Н.В. Петухова | ______________ А.В. Пагоцкая |
| «19» снежня 2022 г. | «19» снежня 2022 г. |

ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНЫ КОМПЛЕКС
ПА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ:
«СУЧАСНЫЯ ФОРМЫ СВЯТОЧНАЙ КУЛЬТУРЫ»

модуля
**СВЯТОЧНАЯ КУЛЬТУРА БЕЛАРУСІ**
для спецыяльнасці 1-17 01 05 Рэжысура свят (па напрамках)

Складальнік:
А.В. Катовіч, кандыдат культуралогіі,
дацэнт кафедры рэжысуры

Разгледжана і зацверджана
на пасяджэнні Савета факультэта мастацкай культуры
«19» снежня 2022 г., пратакол № 5

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**

*А. І. Смолік,* доктар культуралогіі, прафесар, загадчык кафедры культуралогіі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»,

*А. Э. Салікаў,* кандыдат культуралогіі, дацэнт кафедры маладзёжнай палітыкі і сацыякультурных камунікацый Дзяржаўнай установы адукацыі «Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы».

# ЗМЕСТ


| | | |
|---|---|---|
| 1 | ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА…………………………………. | 4 |
| 2 | ТЭАРЭТЫЧНЫ РАЗДЕЛ …………………..…………………. | 8 |
| 3 | ПРАКТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ……………………………………… | 37 |
| 4 | РАЗДЗЕЛ КАНТРОЛЯВЕДАЎ……………………………….. | 46 |
| 5 | ДАПАМОЖНЫ РАЗДЗЕЛ……………………………………... | 52 |

# 1. ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбная дысцыпліна «Сучасныя формы святочнай культуры» – адна са спецыяльных дысцыплін пры падрыхтоўцы высокакваліфікаваных спецыялістаў у галіне святочнай культуры і з'яўляецца адной з вучэбных дысцыплін, якія ўваходзяць ў модуль «Святочная культура Беларусі».

Папярэдняя шматгадовая практыка выкарыстання ВМК па сучаснай святочнай культуры і яе формам дазваляе разглядаць яго як паўнавартасную інавацыйную вучэбна-метадычную літаратуру, якая забяспечвае мэтанакіраванае фарміраванне сацыяльна-прафесійнай кампетэнтнасці будучага спецыяліста ў сферы культуры. Развіваючы патэнцыял комплекса выяўляецца ў абгрунтаваным спалучэнні і ўзаемадзеянні ў вучэбна-выхаваўчым працэсе традыцыйных і інавацыйных метадаў, якія забяспечваюць устойлівыую "зваротныя сувязі" паміж выкладчыкам і студэнтамі. Комплекс уяўляе сабой сістэмны, арганізацыйна-метадычны інструмент, які адпавядае акадэмічным крытэрыям: фундаментальнасці, інфарматыўнасці, сацыякультурнай накіраванасці. Канцэптуальна-базавы сегмент ВМК– гэта змест адрасаваных аўдыторыі студэнтаў тэкстаў лекцый, якія адпавядаюць патрабаванням міждысцыплінарнай інтэграцыі і сучаснай інфармацыйнай парадыгмы навуковай думкі.

Змест ВМКпа дысцыпліне«Сучасныя формы святочнай культуры»пабудаваны ў логіцы непасрэднай сувязі з вывучэннем такіх спецыяльных дысцыплін, як «Гісторыя свят», «Традыцыйная святочная культура», «Сучасная святочная культура Беларусі», «Асновы мастацкага афармлення свят і відовішчаў», «Рэжысура фальклорных прадстаўленняў», «Рэжысура тэатралізаваных масавых свят», «Музычна-шумавое вырашэнне свят» і інш., што дазваляе ў поўнай меры сфарміраваць у студэнтаў глыбокія веды і практычныя навыкі для пошуку шляхоў вырашэння творчых праблем увасаблення святочных дзеянняў.

*Мэта* выкладання вучэбнай дысцыпліны «Сучасныя формы святочнай культуры"–раскрыць духоўна-эстэтычны, патрыятычны, маральна-выхаваўчы і сацыякультурны патэнцыял сучасных форм святочнайкультуры беларускага народа ў падтрыманні ўстойлівага і гарманічнага развіцця этнасу на сучасным этапе яго развіцця.

*Задачы вучэбнай дысцыпліны*:

– вызначыць духоўныя, гістарычныя, маральна-этычныя, пазнавальныя і выхаваўчыя каштоўнасці традыцыйных рытуальна-абрадавых практык беларускага народа ў працэсе фарміравання і развіцця сучасныхформ

святочнай культуры Беларусі;

– паказаць адукацыйна-выхаваўчы патэнцыял сучасных форм святочных культуры беларусаў у працэсе супрацьстаяння сусветнай глабалізацыі;

– раскрыць крэатыўныя магчымасціiснуючых форм святочнай культуры ў працэсефарміравання нацыянальнай ідэнтычнасці сучаснай асобы;

– паказаць духоўныя і сацыякультурныя рэсурсы сучасных форм святочнай культуры ў працэсе гарманізацыі міжкультурных стасункаў этнасаў, якія здаўна пражываюць на тэрыторыі Беларусі;

– раскрыць характар і перспектывы суіснавання,узаемадапаўнення і ўзаемаўзбагачэння традыцыйнай духоўнай спадчыны і сучасных форм святочнай культуры беларускага народа;

– паказаць прыярытэтныя напрамкі фарміравання і далейшага развіцця сучасных форм святочнай культуры Беларусі;

– раскрыць духоўны патэнцыял сістэмы дзяржаўных святкаванняў, міжнародных і рэспубліканскіх фестываляў, конкурсаў і іншых форм святочнай культуры ў працэсе фарміравання патрыятызму, гістарычнай памяці, нацыянальнай самасвядомасці сучаснага грамадзяніна Беларусі;

– вызначыць духоўна-эстэтычныямагчымасціфестывальнага руху ў працэсе фарміравання нацыянальнага менталітэту, талерантнасці, павагі да сваёй гістарычнай спадчыны, сямейных традыцый;

– стымуляваць пошукі шляхоў самастойнага вырашэння творчых праблем у працэсе ўвасаблення сучасных форм святочнай культуры.

У выніку засваення вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен

*ведаць:*

– шляхі, тэндэнцыі і формы развіцця сучаснай святочнай культуры беларускага народа;

– структурна-функцыянальныя аспекты падрыхтоўкі і ўвасаблення сучасных форм святочнай культуры;

– спосабы і сродкі выкарыстання творчага патэнцыялу традыцыйных абрадавых практык у кантэксце развіцця сучасных форм святочнай культуры;

– сэнсава-змястоўныя модулі і тэхналогіі працэсу падрыхтоўкі і ўвасаблення сучасных форм святочнай культуры;

*умець:*

– здзяйсняць праектную дзейнасць па распрацоўцы і ўвасабленні сучасных форм святочнай культуры;

– раскрыць логіку і паслядоўнасць паэтапнай распрацоўкі сцэнарнага плана святочнай імпрэзы;

–выкарыстоўваць псіхолага-педагагічныя прыёмы згуртавання творчага калектыву і размяркоўваць напрамкі дзейнасці удзельнікаў у адпаведнасці з мэтай і задачамі творчага праекта;

*валодаць:*

– навыкамі карыстання навуковай і даведачнай літаратуры для стварэння інавацыйных праектаў па ўвасабленні сучасных форм святочнай культуры;

– уласнай базай даных аб традыцыйных і сучасных святочных практыках;

– методыкай раскрыцця структурна-функцыянальных складовыхсучасных форм святочнай культуры.

У навукова-метадычны кампанент ВМК па дысцыпліне «Сучасныя формы святочнай культура» акрамя тэкстаў лекцый уваходзяць: заданні да семінарскіх заняткаў, пералік тэарэтычных і практычных пытанняў для самастойнай работы студэнтаў, кантрольныя пытанні да экзамена, спіс асноўнай і дадатковай літаратуры, вучэбная праграма і г.д.

Выкарыстанне дадзенага ВМК прадугледжвае творчы падыход да структурыравання лекцыйнага матэрыялу, выбару праблем для дыскусій, актуальнай тэматыкі студэнтскіх даследаванняў, увядзенне ў лекцыі і семінарскія заняткі наглядна-графічнага, відыё-і-гука раду, інфармацыйна-аналітычных фрагментаў, інтэрпрэтацый, тэрміналагічнага слоўніка. Дыдактычнае прызначэнне лекцыйнага матэрыялу заключаецца ў тым, каб увесці студэнтаў у сучасную святочную культуру, авалодаць яе асноўнымі формамі, іх катэгорыямі, заканамернасцямі; паказаць метадалогію, значэнне навуковых канцэпцый для самастойнай практыкі. Перавагай ВМК з’яўляецца яго інавацыйны рэсурс, які абумоўлены гарманічным узаемадзеяннем яго элементаў: навукова-метадычным, ідэйна-выхаваўчым, арганізацыйна-метадычным.

Такім чынам, ВМК па дысцыпліне «Сучасныя формы святочнай культуры» якасна адрозніваецца сваёй архітэктонікай (структурай, стылем тлумачэння тэорыі і сацыякультурнай практыкі, навукова-метадычным забеспячэннем) ад традыцыйнай вучэбнай літаратуры.

Кампетэнцыя, якая павінна быць сфарміравана ў студэнтаў пасля вывучэння вучэбнай дысцыпліны, патрабуе засваення паняццяў: «сучасная святочная культура», «формы святочнай культуры», «святочна-абрадавая падзея», «культурная спадчына», «дзяржаўнае свята», «ваенна-патрыятычнае свята», «свята горада», «свята вёскі», «прафесійнае свята», «мастацка-спартыўнае відовішча», «трансфармацыя», «рэканструкцыя», «міжнародная акцыя», «конкурс», «арт-праект» «баль», «гала-канцэрт», «дэманстрацыя», «відовішча», «гульня», «інсталяцыя», «карнавал», «квэст», «канцэрт», «конкурс», «мюзікл», «перформанс», «прадстаўленне», «парад»,

«рэканструкцыя», «спаборніцтва», «фестываль», «флэш-моб», «хэпэнінг», «цырымонія адкрыцця / закрыцця», «шэсьце», «шоў», «юбілей», «кірмаш-свята» і інш.

Засваенне матэрыялу дадзенай дысцыпліны павінна забяспечыць фарміраванне *спецыялізаванай кампетэнцыі:* ствараць сучасныя святы з улікам пераймання культурна-гістарычных традыцый Беларусі і выкарыстаннем сучасных форм святочнай культуры.

На засваенне вучэбнай дысцыпліны «Сучасныя формы святочнай культуры», дасягненне пастаўленай мэты і вырашэння задач прадугледжана 90 гадзін, з іх аўдыторных – 54: лекцыі – 34, семінарскія заняткі – 20 гадзін. Форма кантролю ведаў студэнтаў – экзамен.

# 1. ТЭАРЭТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ

## 2.1 Канспектлекцый

### *Уводзіны. Станаўленне і стратэгічныя праблемы развіцця сучаснай святочнай культуры*

Дынамічнае развіццё грамадства на сучасным этапе фарміравання дзяржаўнасці, нацыянальнага менталітэту і працэсам этнакультурнай ідэнтыфікацыі вымагае не толькі актуалізацыі шматвяковай этнакультурнай спадчыны – традыцыйных святочна-абрадавых комплексаў, але і адначасовай распрацоўкі сучасных практык святочнай падзейнасці. Улічваючы тыя гістарычныя фактары, што нашы сучасныя мегаполісы фарміраваліся на аснове пакаленняў людзей, якія нарадзіліся ў вясковым асяроддзі і ў пэўнай ступені фарміраваліся ва ўлонні традыцыйнай абрадавай культуры, вырашэнне праблемы дыялогу традыцыйнай і інавацыйнай культуры ўяўляецца складаным і шматаспектным.

Разам з тым наш каляндар сінтэзаваў у сабе і каштоўнасці хрысціянскай духоўнай традыцыі. Аднак другая палавіна XX ст. стала тым часм, калі еўрапейскія народы аказаліся пад моцным ўплывам працэсаў глабалізацыі, у тым ліку і рашэнняў ААН, якія былі скіраваны на пашырэнне інавацыйных культурных праектаў, звязаных з ушанаванняў сусветна вядомых навукоўцаў, творцаў, прадстаўнікоў розных прафесій і спецыяльнасцей. Усё гэта прывяло да ўзнікнення шырокага кола агульнаграмадскіх і вузкаспецыяльных свят. Інавацыйныя культурныя праекты запатрабавалі і прынцыпова іншых па сваёй сутнасці форм і элементаў святочных імпрэз.

Свята як найважнейшая сацыяльна-культурная каштоўнасць: фарміраванне іразвіццё духоўнагасвету асобы; свята як сінтэз духоўных каштоўнасцей, назапашаных сусветнай культурай. Значэнне свята як шматграннай грамадскай з’явы.

Асэнсаванне працэсаў станаўлення і інавацыйнага развіцця сучаснай святочнай культуры Беларусі з улікам яе нацыянальных і этнічных асаблівасцей. Актуальныя сацыякультурныя дэтэрмінанты развіцця сучаснай святочнай культуры:спрыянне ўстойліваму развіццю грамадства, пераемнасць традыцыйных этнакультурных каштоўнасцей, адзінства структурна-функцыянальных аспектаў і вобразных стэрэатыпаў у працэсе фарміравання інавацыйных святочных формаўтварэнняў.

Прыярытэтная тэндэнцыя правядзення святаў рознай накіраванасці ў форме уяўленняў. Эвалюцыя дзейсных аспектаў сучасных відовішчаў: падзел удзельнікаў на артыстаў (актыўных удзельнікаў) і гледачоў (пасіўных назіральнікаў). Сцэнічнае ўвасабленне абрадаў як найважнейшая праблема развіцця масава-імправізацыйнай творчасці людзей. Неадпаведнасць народнай традыцыі: усе ўдзельнікі – актыўныя стваральнікі. Аснова сучаснай структуры святаў – фарміраванне агульнанацыянальных кампанентаў відовішча. Праблема захавання рэгіянальных і мясцовых святочных традыцый. Выкарыстанне прагрэсіўных элементы святочнай культуры горада мінулых стагоддзяў. Творчыя і тэхналагічных аспекты падрыхтоўкі і правядзення сучасных форм святочнай культуры.

**Пытанні для самаправеркі:**

1. Вызначыце змест і сутнасць сучаснага свята.
2. Вызначыце асноўныя рысы міфалогіі, фальклора, этнаграфіі.
3. Пакажыце сувязь паміж традыцыйнай м сучаснай культурай Беларусі.
4. Акрэсліце асноўныя гарызонты сучаснай культуры Бкларусі.

**Літаратура:**

Государственная программа «Культура Беларуси» на 2021 – 2025 годы.

Кодекс Республики Беларусь о культуре от 20 июля 2016 года № 413-З.

*Махлина,* С. Т. Семиотика культуры повседневности : учеб. для студентов высших учебных заведений, обучающихся по гуманитарным направлениям / С. Т. Тевельевна. - 2-е изд., доп. - Москва : Юрайт, 2020. – 253.

*Монина,* Н. П. История и теория праздничной культуры [Электронный ресурс] : учеб. пособие : в 6 частях [16+] / Н. П. Монина ; Омский государственный университет им. Ф. М. Достоевского. – Омск : Омский государственный университет им. Ф.М. Достоевского (ОмГУ), 2019. – Часть 6. История праздничной культуры России Нового и Новейшего времени. – 220 с. – Режим Доступа: https://biblioclub.ru/index.php?page=book&id=575856

***Тэма 1. Тэатралізацыя ў сучаснай святочнай культуры***

Рэжысура масавых прадстаўленняў і святаў, грунтуючыся на агульным падмурку рэжысуры, мае сваю спецыфіку ў сцэнарна-рэжысёрскай апрацоўцы з дапамогай тэатралізацыі рэальных эпізодаў жыцця,

падпарадкаванні іх сцэнарна-рэжысёрскаму ходу і абавязковаму ўключэнню гледачоў у дзеянне. Тэатралізаваны прадстаўленне можа быць як самастойным творам, так і складовай часткай свята. У тэатралізацыі, як адмысловым выглядзе мастацтва выступае на пярэдні план найважнейшы кампанент масавага прадстаўлення – глядач, калектыўны герой.

Манументальнасць тэатралізаванага масавага прадстаўлення вызначаецца наступнымі кампанентамі: маштабнасць абранага падзеі; маштабнасць адбору гістарычных і гераічных вобразаў; адсутнасць псіхалагічнасці ў гульні акцёраў;пластыка рухаў, манументальнасць жэстаў; малюнак мізансцэн; манументальнасць і вобразнасць дэкарацый; асацыятыўнасць эпізодаў; прынцып рэзкіх кантрастаў / у пластыцы, афармленні, музыцы, святле; выкарыстанне іншасказальных сродкаў выразнасці сімвал, метафара, алегорыя; ужыванне навейшых сродкаў тэхнікі і тэхнічных эфектаў.

Асаблівасці выкарыстання вулічнага тэатра ў сучаснай святочнай культуры. Рэжысура вулічных прадстаўленняў. Выкарыстанне гарадскога або прыроднага асяроддзя як мастацкай складовай сучаснага свята. Прыёмы работы з гледачом.

Тэатралізаваныя шэсці і карнавалы: структура і выразныя сродкі (музыка і танец, касцюміраванне, маскі і лялькі). Сродкі руху ўдзельнікаў (хадулі, веласіпеды, платформы, аўтамабілі). Перформансы, акцыі, флэш-мобы, хэпенінгі: тэатральны пачатак відовішчаў. Выкарыстанне элементаў тэатралізацыі падчас правядзення карпаратыўных масавых свят, у гістарычных рэканструкцыях, рэкламных акцыях.

Канцэрт. Гала-канцэрт. Мюзікл.Фальклорнае, тэатралізаванае, дакументальна-публіцыстычнае, эстрадна-цыркавое і іншыя віды прадстаўленняў. Відовішча. Рэканструкцыя.

**Пытанні для самаправеркі:**

1. Вызначыце змест і сутнасць традыцыйнай культуры.
2. Вызначыце асноўныя рысы міфалогіі, фальклора, этнаграфіі.
3. Пакажыце сувязь паміж міфалогіяй, фальклорам, этнаграфіяй, культуралогіяй і рэлігіязнаўствам.
4. Акрэсліце асноўныя гарызонты трохузроўневай мадэлі міфапаэтычнай карціны свету беларусаў.
5. Акрэсліце мадэліруючую аснову бінарных апазіцый у беларускай касмалогіі.

## Літаратура:

Государственная программа «Культура Беларуси» на 2021 – 2025 годы.

Кодекс Республики Беларусь о культуре от 20 июля 2016 года № 413-З.

*Махлина,* С. Т. Семиотика культуры повседневности : учеб. для студентов высших учебных заведений, обучающихся по гуманитарным направлениям / С. Т. Тевельевна. - 2-е изд., доп. - Москва : Юрайт, 2020. – 253.

*Монина,* Н. П. История и теория праздничной культуры [Электронный ресурс] : учеб. пособие : в 6 частях [16+] / Н. П. Монина ; Омский государственный университет им. Ф. М. Достоевского. – Омск : Омский государственный университет им. Ф.М. Достоевского (ОмГУ), 2019. – Часть 6. История праздничной культуры России Нового и Новейшего времени. – 220 с. – Режим Доступа: https://biblioclub.ru/index.php?page=book&id=575856

### *Тэма 2. Гандлёвыя і забаўляльна-гульнявыя кампаненты беларускага кірмашу*

Гандаль як форма куплі-продажу. Рэклама тавару на беларускіх кірмашах. Змест, канструктыўныя асаблівасці і спосабы актывізацыі ўдзельнікаў у гандлёва-гульнявых атракцыёнах. Выстаўкі як дэманстрацыя дасягненняў гаспадаркі.

Кірмаш – святочна абстаўлены расшыраны гандаль, што адбываўся перыядычна ў пэўнай мясцовасці. Прымяркоўваўся да пэўнага прастольнага або храмавага свята (фэсту), ад якога часта атрымліваў назву (троіцкі, ільінскі, спасаўскі, пакроўскі і інш.). Кірмашы здаўна лічыліся своеасаблівымі святамі, іх адкрыцця з хвалюючай нецярплівасцю чакалі і дарослыя і дзеці.

Спецыялізацыя гандлю: агульнагаспадарчыя, конскія, рыбныя, грыбныя, ягадныя кірмашы. Кантрактавыя кірмашы і лясныя кірмашы. Беларускія кірмашы адрозніваліся паміж сабой спецыялізацыяй гандлю: на адных гандлявалі ў асноўным сельскагаспадарчымі таварамі і прадметамі дробных промыслаў, на другіх — пераважна жывёлай (так званыя скотныя, ці конныя кірмашы), на трэціх — прамысловымі таварамі і прадметамі раскошы. У асобную групу вылучаліся так званыя кантрактныя кірмашы (у г.г. Мінск, Пінск, Навагрудак і інш.). Асобныя кірмашы былі вядомы продажам вялікай колькасцю хлеба.

Арганізацыя гандлёвых формаў гандлю даемагчымасць уцягнуць у дзею значную колькасць людзей, садзейнічае іх актывізацыі, стварае жыцярадасны

настрой у гледачоу. Адной з галоўных задач пры увасабленні гульнёвых формаў гандлю з'яуляюцца захаваннеў структуры кірмашу традыцыйных беларускіх гандлёвых атракцыёнаў і стварэнне на гэтай аснове новых ганлёва-гульнёвых формаўтварэнняў. Гульнёвыя атракцыёны узніклі на кірмашах Беларусі у канцы 19 ст. Шырокай папулярызацыі гандлёвых дзей садзейнічала менавіта тое, што яны былі не толькі формай набыцця тавару, але і ператвараліся у своеасабліваю форму адпачынку. У сучаснай кірмашовай культуры гандлёвыя атракцыёны сталі адметнай рысай беларускіх кірмашоў. Пачынаючы з 80-г.г 20ст. яны былі адроджаны ва усіх рэгіёнах Беларусі.

Мастацтва скамарохаў на кірмашах. Народныя забавы як сродак далучэння да ўдзелу ў кірмашы людзей розных узроставых катэгорый. Рэгіянальныя асаблівасці і змест народных забаў. Конкурсы хароў, ансамбляў і выканальнікаў прыпевак. Забаўляльныя гульні кантрактавых кірмашоў. Канцэрты інструментальнай музыкі. Спектаклі тэатраў і імпрэзы цыркаў. Летнія карнавалы.

**Пытанні длясамаправеркі:**

1. Пакажыце канструктыўныя асаблівасці і спосабы актывізацыі ўдзельнікаў у гандлёва-гульнявых атракцыёнах.
2. Назавіце рэгіянальныя асаблівасці і змест народных забаў на кірмашах.
3. Назавіце формы гандлёвых і забаўляльна-гульнявых праграм.

**Літаратура:**

*Асноўная*

*Махлина,* С. Т. Семиотика культуры повседневности : учеб. для студентов высших учебных заведений, обучающихся по гуманитарным направлениям / С. Т. Тевельевна. - 2-е изд., доп. - Москва : Юрайт, 2020. – 253.

*Монина,* Н. П. История и теория праздничной культуры [Электронный ресурс] : учеб. пособие : в 6 частях [16+] / Н. П. Монина ; Омский государственный университет им. Ф. М. Достоевского. – Омск : Омский государственный университет им. Ф.М. Достоевского (ОмГУ), 2019. – Часть 6. История праздничной культуры России Нового и Новейшего времени. – 220 с. – Режим Доступа: https://biblioclub.ru/index.php?page=book&id=575856

*Дадатковая*

Беларусы : у 12 т. / НАН Беларусі,Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы. – Мінск : Беларус. навука. – Т. 6 : Грамадскія традыцыі / В. Ф. Бацяеў [і інш.]. – 2002. – 606 с.

*Валодзіна, Т.В.* Семантыка рэчаў ў духоўнай спадчыне беларусаў / Т.В. Валодзіна. – Мінск, 1999. –160 с.

*Грамадскі* быт і культура сельскага насельніцтва Беларусі / В.К. Бандарчык [і інш.]. – Мінск : Навука і тэхніка, 1993. – 256 с.

Гульні, забавы, ігрышчы / рэдкал.: А.С.Фядосік [і інш.]. – Мінск : Беларус. навука, 1996. – 534 с.

*Гуд, П. А.* Беларускі кірмаш / П. А. Гуд, Н. І. Гуд. – Мінск : Полымя, 1996. – 268 с.

*Котович, О. В.* Белорусская свадьба в пространстве традиционной культуры / О. Котович, Я. Крук. – Минск : Адукацыя і выхаванне, 2012. – 848 с.

*Крук,* І. І. Следам за сонцам: Бел.нар.каляндар: Дапаможнік для педагогаў дзіцячых дашк. устаноў / І.І. Крук. – Мінск : Ураджай, 1998. – 216 с.

*Мальдзіс*, А. І. Беларусь у люстэрку мемуарнай літаратуры XVIII стагоддзя: Нарысы быту і звычаяў / А.І. Мальдзіс. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1982. – 256 с.

Народны тэатр / уклад. М.А. Каладзінскі. – Мінск: Беларус. навука, 2004. – 554с.

Народная культура Беларусі: энцыкл. даведнік / рэд. В.С. Цітоў. – Мінск : БелЭН, 2002. – 431 с.

Традыцыйная мастацкая культура беларусаў: у 6 т. / Т. Б. Варфаламеева, В. І. Басько, М. А. Козенка [і інш.]. – Мінск : Беларуская навука, 2001–2010. – Т. 1 : Магілёўскае Падняпроўе, 2001. – 797 с.

Традыцыйная мастацкая культура беларусаў: у 6 т. / Т. Б. Варфаламеева, А. М. Боганева, М. А. Козенка [і інш.]. – Мінск : Беларуская навука, 2001 – 2010. – Т. 2 : Віцебскае Падзвінне, 2004. – 910 с.

Традыцыйная мастацкая культура беларусаў: у 6 т. / аўт. ідэі Т.Б. Варфаламеева; агул. рэд. Т. Б. Варфаламеева. – Т. 3: Гродзенскае Панямонне. У 2 кн. Кн. 1 / В. І. Басько [і інш.]. – Мінск : Выш. шк., 2006. – 608 с.

Традыцыйная мастацкая культура беларусаў: у 6 т. / аўт. ідэі Т.Б. Варфаламеева; агул. рэд. Т. Б. Варфаламеева. – Т. 3: Гродзенскае Панямонне. У 2 кн. Кн. 2 / А. М. Боганева [і інш.]. – Мінск : Выш. шк., 2006. – 736 с.

Традыцыйная мастацкая культура беларусаў: у 6 т. / аўт. ідэі Т.Б. Варфаламеева; агул. рэд. Т. Б. Варфаламеева. – Т. 4: Брэсцкае Палессе. У 2 кн. Кн. 2 / А. М. Боганева [і інш.]. – Мінск: Выш. шк., 2009. – 863 с.

Традыцыйная мастацкая культура беларусаў: у 6 т. / аўт. ідэі Т.Б. Варфаламеева; агул. рэд. Т. Б. Варфаламеева. – Т. 5: Цэнтральная Беларусь. У 2 кн. Кн. 1 / В. И. Басько [і інш.]. – Мінск: Выш. шк., 2010. – 847 с.

***Тэма 3. Сучасныя фальклорныя святы: формы і фармат іх правядзення***

Міжнародны фестываль “Александрыя збірае сяброў” (а.г. Александрыя, Шклоўскі раён). Ахутанае міфамі і легендамі, старажытнае свята Купалле беларусы любяць і беражліва захоўваюць ужо шматлікія стагоддзі. Кожны год яго адзначаюць прыгожымі гуляннямі: плятуць купальскія вянкі і загадваюць жаданні, запальваюць вогнішчы, спяваюць песні і шукаюць таямнічую папараць-кветку… Самай вялікай святочнай пляцоўкай, дзе Купалле праходзіць з міжнародным размахам, у сучаснай Беларусі стаў аграгарадок Александрыя ў Шклоўскім раёне Магілёўскай вобласці, куды з'язджаюцца тысячы гасцей, каб у адну з самых кароткіх летніх начэй атрымаць асалоду ад яркіх уражанняў на маляўнічым беразе “ракі сяброўства” – Дняпра. “Александрыя” “збірае сяброў” не толькі з усёй Беларусі, але і краін-суседак – Расіі і Украіны. Тры ўсходнеславянскія народы разам святкуюць Купалле вось ужо амаль 10 гадоў: першы маштабны фестываль адбыўся 19 ліпеня 2010 года, а ў 2011-м на ім пабывалі ўдзельнікі са Смаленскай і Кіеўскай абласцей. Традыцыя замацавалася, і з кожным годам да гаспадароў-беларусаў, расіян і ўкраінцаў далучаецца ўсё больш сяброў і з іншых краін. Месца правядзення таксама знакавае.

Са старажытных часоў рака Днепр аб’ядноўвала тры ўсходнеславянскія народы, была артэрыяй знакамітага шляху “з варагаў у грэкі”, які звязваў лёсы людзей, гарады і дзяржавы. Сёння мост, побач з якім праходзіць фестываль, злучае два раёны і дзве вобласці Беларусі – Шклоўскі на Магілёўшчыне і Аршанскі на Віцебшчыне. Ён звязвае гарадскі пасёлак Копысь і Александрыю – малую радзіму Прэзідэнта краіны. Аляксандр Рыгоравіч Лукашэнка падтрымаў ідэю правядзення свята брацкіх народаў, якіх аб’ядноўваюць агульныя традыцыі, гістарычныя і культурныя падзеі. Купалле ў Александрыі стала сапраўдным культурным брэндам Беларусі. І калі першае свята на Магілёўшчыне сабрала 3 тысячы чалавек, то ў 2018 годзе на фестывалі пабывала больш за 110 тысяч гасцей, у тым ліку з Літвы, Латвіі, Эстоніі, Польшчы і Германіі. Расце і тэрыторыя свята, а разам з ёй - калейдаскоп купальскіх падзей. Гэта і народныя забавы – карагоды, скокі праз вогнішча, пляценне вянкоў, пошук папараць-кветкі, і “горад майстроў”, і маштабныя выставы-кірмашы, атракцыёны, майстар-класы, конкурсы і г.д. Кульмінацыяй свята нязменна становіцца гала-канцэрт.

На свяце ў 2012 годзе была арганізавана экспазіцыя “Горада майстроў”, якая разгарнулася на беразе Дняпра ў выглядзе знакамітага купальскага сімвала – сонца, промнямі якога сталі вуліцы рамеснікаў з трох краін.

Таксама ўпершыню была праведзена шырокая дзелавая праграма – пасяджэнне Асацыяцыі гандлёва-прамысловых палат краін Прыдняпроўя, сустрэчы бізнес-колаў Беларусі, Расійскай Федэрацыі і Украіны, работа выставачнага павільёна.

У 2013 годзе на Купалле ў Александрыі былі прэзентаваны новыя праекты, прайшлі фестывалі лёну, квасу, піва, майстар-класы ўдзельнікаў міжнароднага пленэру па кераміцы "Арт-жыжаль", выстава “Археалагічныя знаходкі Верхняга Падняпроўя”.

Першы юбілей свята – у 2014 годзе – аб’яднаў тры маштабныя кірмашы: Ніжагародскі (Расія), Сарочынскі (Украіна) і Александрыйскі (Беларусь). Асноўнае дзейства разгарнулася на тэатралізаванай пляцоўцы “Гасцёўня бульбаша” ў стылізаванай беларускай хаце, дзе гасцей здзіўлялі незвычайнымі забаўкамі і частавалі дзясяткамі нацыянальных страў з бульбы.

У 2015 годзе на фестывальнай сцэне ўпершыню прадставілі мюзікл Максіма Сокала “Папараць-кветка”. Пасля яскравага дэбюту пастаноўка адправілася пакараць гарады Беларусі.

Уладкоўваць тэатралізаваныя паказы стала яшчэ адной добрай традыцыяй Купалля ў Александрыі. У купальскі “Горад сяброўства” ў 2016 годзе на Мінскі, Маскоўскі і Кіеўскі “вуліцы” прыбылі госці з краін-суседак, каб прадставіць сваю культуру, пачаставаць стравамі нацыянальнай кухні, стварыць каларытную атмасферу вясёлага славянскага кірмашу. Акрамя таго, упершыню была арганізавана экскурсія па галоўных лакацыях Купалля. А пасля “Александрыйскай вандроўкі” госці з задавальненнем назіралі, як спраўджваецца “Купальская казка”.

У 2017 годзе свята ў Александрыі ўжо ў статусе міжнароднага фестывалю прапанавала гледачам эстрадна-цыркавую пастаноўку “Купальскі сон” з удзелам калектываў з Расіі, Украіны, Літвы, Латвіі, Эстоніі і Польшчы.

Кульмінацыяй свята ў 2018 годзе стаў мюзікл “Малая радзіма”, другая ж частка фестывалю была прысвечана Дням культуры Украіны ў Беларусі. Гасцей забаўлялі на Сарочынскім кірмашы, частавалі баршчом і галушкамі, здзіўлялі конным тэатралізаваным шоу “Кіеўская Русь”. Фестываль у Александрыі стаў укладам Беларусі ва ўмацаванне сяброўства паміж народамі. У цудоўным, чыстым кутку Магілёўшчыны магутны Днепр аб'ядноўвае майстроў і аматараў народнага мастацтва з Беларусі, Расіі і Украіны, а сама Александрыя стала месцам сяброўскіх сустрэч.

Рэспубліканскае свята “Купалле”: умовы, патрабаванні, магчымасці. “Горад майстроў”, “Горад сяброў”, выставы (“Археалагічныя знаходкі Верхняга Падняпроўя»), кірмашы, фэсты ільну, піва, кваса. Сцэнічнае

ўвасабленне народнага свята Купалле. Мюзікл. Эстрадна-цыркавое прадстаўленне. Гала-канцэрт.

Рэспубліканскі фестываль аўтэнтычнага фальклору “Берагіня” (г.п. Акцябрскі). Асноўныя накірункі правядзення фестывалю. Прэзентацыя-конкурс народных абрадавых і побытавых танцаў. Конкурс калектываў-захавальнікаў рэгіянальных аўтэнтычных песенных традыцый. Узроставыя катэгорыі ўдзельнікаў.

Абласны фестываль народнай традыцыйнай культуры Віцебскай вобласці “Вялікая вясельніца”. Формы і фармат правядзення фестывалю. Папулярызацыя рэгіянальных вясельных традыцый. Прэзентацыя вясельных традыцый рускіх старавераў, яўрэяў. Далучэнне да правядзення фестывалю ўсіх устаноў культуры рэгёну правядзення фестывалю.

**Пытанні длясамаправеркі:**

1. Пералічыце ўмовы, патрабаванні, магчымасці міжнароднага фестываля “Александрыя збірае сяброў”.
2. Пералічыце ўмовы, патрабаванні, магчымасці рэспубліканскага свята “Купалле”.
3. Назавіце асноўныя накірункі правядзення рэспубліканскага фестываля аўтэнтычнага фальклору “Берагіня”.
4. Пералічыце ўмовы, патрабаванні, магчымасці
5. Назавіце формы і фармат абласнога фестываля народнай традыцыйнай культуры Віцебскай вобласці “Вялікая вясельніца”.

**Літаратура:**

*Асноўная*


Государственная программа «Культура Беларуси» на 2021 – 2025 годы.

Кодекс Республики Беларусь о культуре от 20 июля 2016 года № 413-З.

*Махлина,* С. Т. Семиотика культуры повседневности : учеб. для студентов высших учебных заведений, обучающихся по гуманитарным направлениям / С. Т. Тевельевна. - 2-е изд., доп. - Москва : Юрайт, 2020. – 253.

*Монина,* Н. П. История и теория праздничной культуры [Электронный ресурс] : учеб. пособие : в 6 частях [16+] / Н. П. Монина ; Омский государственный университет им. Ф. М. Достоевского. – Омск : Омский государственный университет им. Ф.М. Достоевского (ОмГУ), 2019. – Часть 6. История праздничной культуры России Нового и Новейшего времени. – 220 с. – Режим Доступа: https://biblioclub.ru/index.php?page=book&id=575856

*Дадатковая*

Беларусы : у 12 т. / НАН Беларусі,Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы. – Мінск : Беларус. навука. – Т. 6 : Грамадскія традыцыі / В. Ф. Бацяеў [і інш.]. – 2002. – 606 с.

Беларусы: Т. 7: Вусная паэтычная творчасць / НАНБ; Г. А. Барташэвіч, [і інш.]; рэдкал.: В.М. Бялявіна[і інш.]. – 2004. – 586 с.

Беларускі народны каляндар/ аўт.-уклад. А. Ю. Лозка. – Мінск : Полымя, 1992. – 205 с.

*Грамадскі* быт і культура сельскага насельніцтва Беларусі / В.К. Бандарчык [і інш.]. – Мінск : Навука і тэхніка, 1993. – 256 с.

Гульні, забавы, ігрышчы / рэдкал.: А.С.Фядосік [і інш.]. – Мінск : Беларус. навука, 1996. – 534 с.

*Гуд, П. А.* Ад Каляд да Пакроваў / П. А. Гуд ; рэд.-склад. Л. І. Жук. – Мінск : Красіка-Прынт, 2000. – 223 с. – (Беларусь святочная).

*Гуд, П. А.* Беларускі купальскі комплекс і семантыка абрадавых дзей / П. А. Гуд. – Мінск : Тэхнапрынт, 1999. – 221 с.

*Гуд, П. А.* Беларускі кірмаш / П. А. Гуд, Н. І. Гуд. – Мінск : Полымя, 1996. – 268 с.

Жыццяадвечны лад. Беларускія народныя прыкметы і павер'і / уклад., прадм. і пер. У. Васілевіча. – Мінск : Мастац. літ., 1998. – Кн. 2. – 607 с.

Земляробчы каляндар: абрады і звычаі / Акад. навук БССР, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору; [рэд. кал.: В. К. Бандарчык, К. П. Кабашнікаў, А. С. Фядосік (гал. рэд.) ; уклад., класіфікацыя, сіст. матэрыялаў і камент. А. І. Гурскага; уступ. арт. А. І. Гурскага, А. С. Ліса]. – Мінск : Навука і тэхніка, 1990. – 405 с.

*Котович, О. В.* Белорусская свадьба в пространстве традиционной культуры / О. Котович, Я. Крук. – Минск : Адукацыя і выхаванне, 2012. – 848 с.

*Крук,* І. І. Следам за сонцам: Бел.нар.каляндар: Дапаможнік для педагогаў дзіцячых дашк. устаноў / І.І. Крук. – Мінск : Ураджай, 1998. – 216 с.

*Крук, Я.* Сімволіка беларускай народнай культуры : навук. выд. / Я. Крук. – Мінск : Беларусь, 2011. – 430 с.

Народны тэатр / уклад. М.А. Каладзінскі. – Мінск: Беларус. навука, 2004. – 554с.

Народная культура Беларусі: энцыкл. даведнік / рэд. В.С. Цітоў. – Мінск : БелЭН, 2002. – 431 с.

### *Тэма 4. Грамадская запатрабаванасць гістарычных і ваенных рэканструкцыйна сучасным этапе*

Гістарычная або ваенна-гістарычная рэканструкцыя як відовішча. Працэс аднаўлення матэрыяльнай і духоўнай культуры пэўнай гістарычнай эпохі, рэгіёна, творчы экскурс у гісторыю. Рух гістарычнай рэканструкцыі на сучасным этапе.

Існуе шмат спосабаў захаваць гістарычную памяць: фільмы, музейныя выставы, экскурсіі, аб’яднаныя тэмай вайны. Але яны не даюць прачуць падзеі так, як гістарычная рэканструкцыя і ваенна–гістарычныя фестывалі. Менавіта яны дапамагаюць ацаніць рэальны маштаб падзей.

Адной з галоўных задач пры арганізацыі ваенна-гістарычных фестываляў і рэканструкцый з’яўляецца экскурс у гісторыю. Гэта не толькі яркае відовішча, якое прываблівае гістарычнымі касцюмамі розных эпох і піратэхнікай, гэта важны элемент абуджэння грамадскай цікавасці да ваеннай гісторыі сваёй краіны, гонару за подзвігі продкаў.

У Беларусі дзейнічаюць клубы, якія займаюцца рэканструкцыяй гістарычных падзей. Прымаючы ўдзел у розных фестывалях, яны дапамагаюць акунуцца ў атмасферу пэўнай эпохі. Рэканструктары чэрпаюць ідэі з гістарычнага мінулага. У сувязі з гэтым з'явілася мноства фарматаў. Аднак на сённяшні дзень у Беларусі найбольш папулярныя два: “жывая гісторыя” і ваенна-гістарычная рэканструкцыя.

Фармат “Жывая гісторыя” максімальна поўна і дакладна ўзнаўляе лад жыцця людзей дадзенай мясцовасці ў пэўны гістарычны перыяд.Звычайна такога кшталту мерапрыемствы праходзяць у выглядзе фестываляў ці “жывых” музеяў пад адкрытым небам. Яны могуць працаваць як часова, так і на пастаяннай аснове.

Фармат ваенна-гістарычнай рэканструкцыі дазваляе маштабна адлюстраваць ваеннае мінулага краіны. Рэканструктараў аб'ядноўвае любоў да гісторыі. Аднаўленне ваеннай формы савецкіх і нямецкіх салдат, зброя, тэхніка. Ёсць у рэканструкцыі і праблемы, якія часцей усяго звязаны з непрафесіяналізмам удзельнікаў. Рэканструкцыя – гэта не тэатральнае дзеянне. Найгранасць, непрадуманасць прадстаўлення гістарычнай падзеі, дрэнная арганізацыя для гледачоў, адсутнасць даступнасці да месца рэканструкцыі – гэта тое, што можа пагоршыць рэчаіснасць. Станоўчае рэканструкцый: адукацыйны кампанент (глядач можна дакрануцца да рэальнага танка, убачыць на свае вочы бітву і патрымаць у руках рэальную зброю).

Новы падыход да вывучэння гісторыі.Аднаўленне карцінак ваеннага мінулага адназначна выхоўвае патрыятызм. Маштабныя мерапрыемствы наведваюць тысячы людзей, а па ўсёй краіне адчыняюцца ваенна-гістарычныя і ваенна-патрыятычныя клубы (група ваенна-гістарычнай рэканструкцыі "Апошні рубеж" (Магілёў), ваенна-гістарычны клуб рэканструкцыі вайны 1812 года "Цытадэль" (Бабруйск), ваенна-гістарычны клуб "Салдаты Перамогі" (Мінск), ваенна-гістарычны клуб "ГАРНІЗОН" (Брэст), клуб гістарычнай рэканструкцыі "Старая Вежа" (Гомель) і многія іншыя).

Рэканструкцыя гістарычных падзей можа ўспрымацца як спосаб падтрымання гістарычнай памяці: жывых сведак вайсковай эпохі застаецца вельмі мала, сучасная моладзь не ведае сваіх продкаў, якія ўдзельнічалі ў ваенных бітвах, не заўсёды адчувае кроўную сувязь з эпохай. Для іх удзел у рэканструкцыях можа стаць спосабам зразумець і ўбачыць на свае вочы тое, што перажылі іх продкі.

Важна тое, якім чынам арганізавана ваенна–гістарычная рэканструкцыя: на што зроблены акцэнты, якія гістарычныя даныя мае, якая ступень дакладнасці выкарыстоўваюцца ў ёй фактаў, які настрой удзельнікаў і гэтак далей. Ключавая роля – рэжысёр.

На працягу года ў розных кутках нашай краіны праходзяць цікавыя ваенна-гістарычныя рэканструкцыі і фестывалі.Пры падтрымцы Міністэрства абароны Рэспублікі Беларусь на тэрыторыі гісторыка-культурнага комплексу “Лінія Сталіна” праходзіць фестываль “Баграціён”, прысвечаны галоўнаму святу Рэспублікі Беларусь - Дню Незалежнасці. У рамках фестывалю праводзіцца маштабная ваенна-гістарычная рэканструкцыя падзей Вялікай Айчыннай вайны, якія адбыліся 28 чэрвеня 1944 года падчас Беларускай наступальнай аперацыі пад аднайменнай назвай. Для наведвальнікаў адкрыта некалькі інтэрактыўных зон: кожны можа паспрабаваць свае сілы ў гістарычнай віктарыне, стральбе з пнеўматыкі, зборцы-разборцы зброі, кіданні гранаты і ўнікальнага інтэрактыўнага стралковага трэнажора з пісталета ПМ, а самыя актыўныя ўдзельнікі ўзнагароджваюцца памятнымі падарункамі. У мерапрыемстве прымаюць удзел рэканструктары з Беларусі, Расіі і Украіны. Агульная колькасць удзельнікаў - больш за 130 чалавек.

Фестываль ваеннай рэканструкцыі "Бярэзіна".Фестываль нагадвае падзеі, якія разгарнуліся больш за 200 гадоў таму: ля вёсак Студзёнка і Брылі адбылася знакамітая пераправа французскага імператара праз Бярэзіну. Увосень 1812-га расійскае войска паспрабавала акружыць абяскроўленыя войскі французаў і канчаткова іх знішчыць. Пазбеглі фатальны зыход напалеонаўскія пантанеры: знаходзячыся ў жудасных кліматычных умовах,

яны ахвяравалі сабой у лістападзе 1812 года, каб навесці два масты праз Бярэзіну (усе загінулі ад пераахаладжэння). Дзякуючы іх подзвігу, войска Напалеона было перапраўлена праз раку. Фестываль збірае больш за 5000 чалавек і становіцца чарговым мерапрыемствам памяці: пра мужнасць, геройства і ахвярнасць.

Фестываль "Легендарныя эпохі".Гісторыя Беларусі багатая на легендарныя падзеі, апетыя ў летапісах і вядомыя далёка за межамі нашай краіны. Шлях з «Вараг у Грэкі», першыя княствы, «Бітва на Нямізе», «Грунвальдская бітва», вайна 1812 года, падзеі Першай і Другой сусветных войнаў… Эпахальныя падзеі рабіліся рукамі і ідэямі знакамітымі людзей нашай зямлі.Фестываль "Легендарныя Эпохі" расказвае пра некалькі гістарычных перыядаў развіцця нашай Радзімы ў інтэрактыўным фармаце: Ранняе Сярэднявечча ("Эпоха вікінгаў"), X-XII стст., Сярэднія Вякі ("Эпоха рыцараў"), XIII-XV стст., Шляхта Рэчы Паспалітай («Эпоха шляхты»), XVI-XVIII стст., Эпоха Напалеона («Эпоха 1812»). Кожная з гэтых чатырох легендарных эпох прадстаўлена на фестывалі асобнай пляцоўкай са сваёй праграмай. Кожная пляцоўка складаецца з гістарычнага лагера і інтэрактыўнай пляцоўкі, дзе праходзіць фестывальная праграма: паказальныя выступленні, інсцэніроўкі, рэканструкцыі, выступленне музыкантаў, танцораў, турнірныя паядынкі і многае.

Ваенна-гістарычная рэканструкцыя Бабруйскай наступальнай аперацыі "Бабруйскі кацёл". 27 чэрвеня 2021 года ў Бабруйскім раёне ўпершыню адбылася грандыёзная і ўнікальная падзея, якая па сваіх маштабах саступае толькі мерапрыемствам, якія праводзяцца ў Брэсцкай крэпасці. 1,3 км на паўночны ўсход ад вёскі Шчаткава разгарнулася ваенна-гістарычная рэканструкцыя «Бабруйскі кацёл», у якім прынялі ўдзел каля трох дзясяткаў ваенна-гістарычных клубаў з Беларусі, Расіі і Чэхіі.У 1,3 км ад вёскі Шчаткава прайшла ваенна-гістарычная рэканструкцыя, у якой прынялі ўдзел каля 30 ваенна-гістарычных клубаў.Ваенна-гістарычная рэканструкцыя падзей канца чэрвеня 1944 года стала кульмінацыяй ваенна-патрыятычнага злёту, рэканструкцыя захопу і ўтрымання пераправы і плацдарма на заходнім беразе Бярэзіны. Было задзейнічана больш за 10 адзінак гістарычнай ваеннай тэхнікі — танкі, артылерыя, аўтамабілі, вялікая колькасць піратэхнічных эфектаў.Арганізатарамі з'ўляліс ваенна-гістарычная ўстанова "Ваенны клуб баявой славы" і Бабруйскі райвыканкам пры падтрымцы Міністэрства абароны.

Задачы ваенна-гістарычных фестываляў і рэканструкцый – экскурс у гісторыю, абуджэнне грамадскай цікавасці да ваеннай гісторыі краіны, гонар за подзвігі продкаў. Адукацыйнаяі выхаваўчая кампанент ваенна-

гістарычных фестываляў і рэканструкцый, новы падыход да вывучэння гісторыі.

Гісторыка-культурны комплекс "Лінія Сталіна" - адзін з найбольш грандыёзных фартыфікацыйных ансамбляў на тэрыторыі Беларусі.

**Пытанні длясамаправеркі:**

1. Як вы разумееце паняцце "гістарычная або ваенна-гістарычная рэканструкцыя як відовішча".
2. Пералічыце задачы ваенна-гістарычных фестываляў і рэканструкцый.
3. У чым адбываецца адукацыйная і выхаваўчая кампанент ваенна-гістарычных фестываляў і рэканструкцый.
4. У чым вы бачыце новы падыход да вывучэння гісторыі.
5. Назавіце два асноўных фармата рэканструкцый.
6. Адзначце ролю ваенна-гістарычных клубаў.

**Літаратура:**


Государственная программа «Культура Беларуси» на 2021 – 2025 годы.

Кодекс Республики Беларусь о культуре от 20 июля 2016 года № 413-З.

*Махлина,* С. Т. Семиотика культуры повседневности : учеб. для студентов высших учебных заведений, обучающихся по гуманитарным направлениям / С. Т. Тевельевна. - 2-е изд., доп. - Москва : Юрайт, 2020. – 253.

*Монина,* Н. П. История и теория праздничной культуры [Электронный ресурс] : учеб. пособие : в 6 частях [16+] / Н. П. Монина ; Омский государственный университет им. Ф. М. Достоевского. – Омск : Омский государственный университет им. Ф.М. Достоевского (ОмГУ), 2019. – Часть 6. История праздничной культуры России Нового и Новейшего времени. – 220 с. – Режим Доступа: https://biblioclub.ru/index.php?page=book&id=575856


## *Тэма 5. Мастацка-спартыўныя відовішчы агульнасусветнага і рэспубліканскага ўзроўню*

Відовішчы і прадстаўленні на стадыёнах. Комплекс разнастайных спартыўных, культурных, мастацка-тэматычных мерапрыемстваў на вялікай тэрыторыі (стадыёны, паркі, вуліцы). Навыкі арганізацыі вялікай колькасці ўдзельнікаў. Сродкі мастацкай выразнасці. Трохмерная адкрытая прастора. Амфітэатр. Мастацка-спартыўныя мерапрыемствы на вадзе.

Традыцыі провадаў і сустрэч беларускіх спартсменаў. Мастацкае вырашэнне цырымоній адкрыцця і закрыцця спартыўных гульняў.

Змест і задачы правядзення алімпіяд, паралімпіяд. Сучасныя Алімпійскія гульні з'яўляюцца найважнейшым сацыяльным феноменам, які не толькі аказвае глабальны ўплыў на спартыўнае жыццё сусветных дзяржаў, але і мае вялікае сацыяльнае і агульначалавечае значэнне. Гульні, адроджаныя французскім грамадскім дзеячам баронам П'ерам дэ Кубертэнам, «…аб'ядноўваюць спартсменаў усіх краін у сумленных і раўнапраўных спаборніцтвах». Алімпійскія прынцыпы маюць дэмакратычную сутнасць і закліканы аб'ядноўваць мільёны людзей ва ўсім свеце незалежна ад іх расавай, рэлігійнай ці палітычнай прыналежнасці. Нягледзячы на прынцыповае аддзяленне Алімпійскага руху ад міжнароднай палітычнай кан'юнктуры, Алімпійскія гульні неаднаразова станавіліся інструментам у руках палітыкаў, якія вырашалі свае асабістыя або нацыянальныя інтарэсы. Так было падчас правядзення XI Алімпійскіх гульняў 1931 гады ў Берліне і XXII Алімпійскіх гульняў 1980 гады ў Маскве. Цяпер палітычная сітуацыя ў свеце зноў абвастрылася, і гэта не можа не адбівацца на Алімпійскім руху. Скандалы, звязаныя з правядзеннем Гульняў у Пекіне і Афінах змяніліся допінгавымі скандаламі, з-за якіх на бліжэйшыя Алімпіяды могуць не патрапіць нацыянальныя каманды некаторых краін. Сёння Алімпійскія Гульні як ніколі блізкія да страты свайго сапраўднага значэння, але ў той жа час менавіта надыходзячыя Алімпіяды могуць зноў аб'яднаць нацыі і стаць найважнейшымі падзеямі ў справе захавання ўсеагульнага свету.

Асноўныя прынцыпы алімпійскага руху (Алімпізму) пералічаны ў Алімпійскай хартыі:

1. Алімпізм уяўляе сабой філасофію жыцця, якая ўзвышае і аб'ядноўвае ў збалансаванае цэлае годнасці цела, волю і розум. Алімпізм, які злучае спорт з культурай і адукацыяй, імкнецца да стварэння ладу жыцця, які засноўваецца на радасці ад намагання, выхаваўчай каштоўнасці добрага прыкладу, сацыяльнай адказнасці і на павазе да ўсеагульных асноўных этычных прынцыпаў.

2. Мэта Алімпізма заключаецца ў тым, каб паставіць спорт на службу гарманічнага развіцця чалавецтва, спрыяючы стварэнню мірнага грамадства, якое клапоціцца аб захаванні чалавечай годнасці.

3. Алімпійскі рух уяўляе сабой узгодненую, арганізаваную, універсальную і пастаянную дзейнасць усіх асоб і арганізацый, якія натхняюцца каштоўнасцямі Алімпізму, што ажыццяўляецца пад кіраўніцтвам МАК. Гэтая дзейнасць ахоплівае пяць кантынентаў. Вяршыняй яе з'яўляецца аб'яднанне спартсменаў усяго свету на вялікім спартыўным свяце -

Алімпійскіх гульнях. Сімвалам алімпійскага руху з'яўляюцца пяць пераплеценых кольцаў. . Заняткі спортам - адно з правоў чалавека. Кожны павінен мець магчымасць займацца спортам, не падвяргаючыся дыскрымінацыі, у духу Алімпізму, што мае на ўвазе паразуменне ў духу сяброўства, салідарнасці і сумленнай гульні.

4. Разумеючы, што спорт функцыянуе ў рамках грамадства, спартыўныя арганізацыі ўнутры Алімпійскага руху павінны мець правы і абавязацельствы, уласцівыя аўтаномным арганізацыям, што ўключае ў сябе: незалежнае стварэнне спартыўных правіл і кантроль над імі, вызначэнне структуры і кіраўніцтва сваімі арганізацыямі, выкананне права на правядзенне выбараў, свабодных ад любога знешняга ўздзеяння, а таксама адказнасць за забеспячэнне прымянення прынцыпаў добрасумленнага кіравання.

5. Ажыццяўленне правоў і свабод, якія прадугледжваюцца сапраўднай Алімпійскай хартыяй, павінна быць забяспечана ў адсутнасць якой-небудзь формы дыскрымінацыі - расавага, моўнага, рэлігійнага, палітычнага характару, па прыкмеце колеру скуры, полу, сэксуальнай арыентацыі, наяўнасці іншага меркавання, нацыянальнага або сацыяльнага паходжання, валодання ўласнасцю, нараджэння ці іншага статусу.

6. Прыналежнасць да алімпійскага руху патрабуе захавання палажэнняў Алімпійскай хартыі і прызнання Міжнародным алімпійскім камітэтам. Хартыі таксама прыведзена вызначэнне сучасных Алімпійскіх гульняў: «Алімпійскія гульні - гэта спаборніцтвы ў індывідуальных або камандных відах спорту сярод спартсменаў, але не сярод краін. Яны аб'ядноўваюць спартсменаў, адабраных адпаведнымі НАК, заяўкі якіх былі прыняты МАК. Спартсмены спаборнічаюць пад тэхнічным кіраўніцтвам адпаведных МФ».

Галоўным сімвалам (эмблемай) Алімпійскага руху з'яўляюцца Алімпійскае кольцы – пяць змацаваных кольцаў, якія сімвалізуюць аб'яднанне пяці заселеных частак свету ў Алімпійскім руху.

Еўразійскіх гульняў. Спартакіяды і універсіяды на сучасным этапе. Мінскі паўмарафон. Міжнародны турнір аматараў хакея на прыз Прэзідэнта РБ. Рэспубліканскае спартыўнае свята «Мінская лыжня» і інш.

**Пытанні длясамаправеркі:**

1. Як вы разумееце алімпійскі рух
2. Азначце змест і задачы алімпійскіх гульняў.
3. Якія спартакіяды і універсіяды на сучасным этапе вы ведаеце.

## Літаратура:

Государственная программа «Культура Беларуси» на 2021 – 2025 годы.

Кодекс Республики Беларусь о культуре от 20 июля 2016 года № 413-З.

*Махлина,* С. Т. Семиотика культуры повседневности : учеб. для студентов высших учебных заведений, обучающихся по гуманитарным направлениям / С. Т. Тевельевна. - 2-е изд., доп. - Москва : Юрайт, 2020. – 253.

*Монина,* Н. П. История и теория праздничной культуры [Электронный ресурс] : учеб. пособие : в 6 частях [16+] / Н. П. Монина ; Омский государственный университет им. Ф. М. Достоевского. – Омск : Омский государственный университет им. Ф.М. Достоевского (ОмГУ), 2019. – Часть 6. История праздничной культуры России Нового и Новейшего времени. – 220 с. – Режим Доступа: https://biblioclub.ru/index.php?page=book&id=575856

### *Тэма 6. Роля музычныхі творчых фестываляў, свят і конкурсаў на сучасным этапе*

Гісторыя ўзнікнення штогадовага міжнароднага музычнага фестываля “Еўрабачанне”. Мэта конкурса: садзейнічаць з'яўленню таленавітых і арыгінальных песень у жанры поп-музыкі пры дапамозе спаборніцтва паміж аўтарамі і спевакамі і шляхам параўнання іх творчасці на міжнародным узроўні.Умовы песеннага конкурсу.Галасаванне 1)Кожная краіна мае нацыянальнае журы. 2) Усе краіны абавязаны ўкараніць сістэму тэлегаласавання. 3) Час для галасавання тэлегледачоў складае ад 15 да 30 хвілін. 4) Усе тэлегледачы конкурсу маюць права галасаваць за выканаўцу (за выключэннем сваёй краіны). Патрабаванні да песні 1)Песні на "Еўрабачанні" павінны быць новымі. Нельга заяўляць на конкурс песню, камерцыйны рэліз якой адбыўся да 1 верасня папярэдняга года. 2) Максімальна магчымая працягласць песні - 3 хвіліны. 3)Песня можа быць напісана на любой мове. Патрабаванні да выканаўца. 1) Мінімальны ўзрост удзельніка - 16 гадоў. Для выканаўцаў, якія не дасягнулі ўзросту шаснаццаці гадоў, існуе дзіцячы конкурс песні "Еўрабачанне". 2) Адзін і той жа артыст не можа ўдзельнічаць ад дзвюх краін адначасова. 3)Нацыянальнасць выканаўца не мае значэння. Любы выканаўца можа прадстаўляць любую краіну, нават не з'яўляючыся яе грамадзянінам. Патрабаванні да выступлення 1) Сцэнічнае выкананне павінна быць аднолькава ва ўсіх рэпетыцыях і жывым шоу. 2)На сцэне могуць знаходзіцца не больш за шэсць артыстаў (выканаўцаў, іх бэк-

вакалістаў, падтанцоўкі) адначасова. 3) Удзельнікам забаронена з'яўляцца на сцэне і ў грамадстве ў непрыстойным выглядзе і здзяйсняць дзеянні праваканцыйнага характару. 4)Забаронены палітычныя выказванні; не дапускаюцца нецэнзурныя або абразлівыя выказванні і камерцыйныя паведамленні. 5) Не дазваляецца знаходжанне на сцэне падчас выступу жывых жывёл. 6) Ад выканаўцаў патрабуецца "жывое" выкананне песні, выкарыстанне фанаграмы голасу, а таксама камп'ютарных эфектаў апрацоўкі голасу забаронена. Прамы эфір. Падвядзенне вынікаў. Краіна-пераможца. Музычны кантракт.

Дзіцячы міжнародны музычны фестываль “Еўрабачанне”. Умовы песеннага конкурсу для дзяцей.

“Праз мастацтва – да міра і ўзаемапаразумення” – дэвіз Міжнароднага фестываля мастацтваў “Славянскі базар ў Віцебску”. У гэтым дэвізе заключаны асноўныя ідэі Міжнароднага фестывалю мастацтваў "Славянскі базар у Віцебску". Гэты зварот да ўсіх удзельнікаў фестывалю, заклік да міру, гармоніі і дасканаласці.

Сваю гісторыю фестываль "Славянскі базар", які праходзіць у Віцебску, вядзе з 18 ліпеня 1992 года. Каля вытокаў фестывалю стаялі тры дзяржавы Расія, Беларусь і Украіна. У першы год арганізатары мелі даволі сціплыя мэты: азнаёміць віцебскага гледача з песеннай творчасцю славянскіх краін. Вопыт першага "Славянскага базару" паказаў, што цікавасць да гэтай творчасці вялікая і што фестывальныя рамкі павінны ахопліваць не толькі песеннае мастацтва. У 1993 годзе музычны фестываль "Славянскі базар" стаў членам Міжнароднай Федэрацыі арганізатараў фестываляў (FIDOF). На флагштоку фестывалю ў 1993 годзе ўпершыню з'явіліся флагі Балгарыі, Кіргізіі, Літвы, Славакіі, Турцыі, Югаславіі. У 1994 годзе ўпершыню на фестывалі ў будынку Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Коласа адкрыўся Цэнтр нацыянальных культур. Менавіта там адбыліся канцэрты нацыянальных дэлегацый, мерапрыемствы, прысвечаныя Дням культуры Беларусі, Расіі, Украіны, Балгарыі, Польшчы.

З 1995 года "Славянскі базар" пачаў называцца Міжнародным фестывалем мастацтваў. Упершыню ў рамках фестывалю дэманстравалася вялікая праграма фільмаў славянскага кіно, прысвечаная векавому юбілею сусветнага кінематографа. Упершыню на фестываль прыехалі прадстаўнікі Кіпра, Нідэрландаў, Грэцыі, Узбекістана і Швейцарыі. У 1996 годзе Міжнародны фестываль "Славянскі базар" стаў членам міжнароднай Еўраазіяцкай асацыяцыі стваральнікаў фестываляў. У 1998 годзе фестываль у Віцебску стаў міждзяржаўным культуралагічным праектам Саюза Расіі і Беларусі. З гэтага года Міжнародны фестываль мастацтваў пачаў называцца

"Славянскі базар у Віцебску". Сама назва стала падкрэсліваць яго прыналежнасць віцебскай зямлі. Канцэпцыя фестывалю ў 1999 годзе адлюстроўвала тэму ўмацавання Саюза Беларусі і Расіі. Дзень Беларусі на "Славянскім базары ў Віцебску" стаў адначасова і ўрачыстасцю адкрыцця свята, а Дзень Расіі - яго завяршэннем.

У 2000 годзе на "Славянскі базар у Віцебску" з'ехаліся прадстаўнікі ўсіх славянскіх народаў, якія жывуць на Зямлі. Упершыню на фестывалі адбыўся канцэрт аўтарскай песні. У 2003 годзе на XII фестывалі мастацтваў упершыню быў праведзены Дзень Саюзнай дзяржавы. З таго часу ён стаў традыцыйным. Тады ж упершыню прайшло Свята славянскай паэзіі, арганізаванае па ініцыятыве групы беларускіх аўтараў. У рамках фестывалю прайшоў першы Міжнародны дзіцячы музычны конкурс. Нарадзілася на фестывалі і яшчэ адна традыцыя: упершыню яго праграма выйшла за рамкі Віцебска. Канцэрты гасцей і ўдзельнікаў гэтага свята мастацтваў прайшлі ва ўсіх абласных цэнтрах і ў Мінску.

У 2004 годзе ў рамках Міжнароднага фестывалю мастацтваў "Славянскі базар у Віцебску" ўпершыню прайшоў Міжнародны маладзёжны форум, у якім прынялі ўдзел прадстаўнікі маладзёжных арганізацый з сямі краін. Важнай асаблівасцю фестывалю 2006 года стала тое, што адначасова з юбілеем Міжнароднага фестывалю мастацтваў "Славянскі базар у Віцебску" святкавалася пятнаццацігоддзе незалежных дзяржаў Беларусі, Расіі і Украіны.

У 2007 годзе ў Віцебску ўпершыню выступілі артысты з Афрыкі. Вышэйшым органам фестывалю з'яўляецца Арганізацыйны камітэт. У склад Аргкамітэта ўваходзяць вядомыя палітыкі, дзеячы культуры і мастацтва трох славянскіх дзяржаў - Беларусі, Расіі, Украіны. Праграма фестывалю ўключае Міжнародны конкурс маладых выканаўцаў эстраднай песні; Міжнародны дзіцячы музычны; гала канцэрты майстроў мастацтваў Беларусі, Расіі і Украіны, канцэртныя праграмы "зорак" эстрады і інш. Лагатып фестывалю ўяўляе сабой графічную выяву кветкі васілька (традыцыйнай для славянскіх народаў), размешчанай на нотнай табары і якая закрывае яе. На лінейках нотнага табара, якія сімвалізуюць музычныя напрамкі ў мастацтве, размяшчаецца слоўны лагатып "Славянскі базар у Віцебску" на беларускай мове, што вызначае пастаяннае месца правядзення фестывалю. Назва фестывалю паўтараецца на рускай і англійскай мовах, размяшчаючыся па крузе вакол фестывальнага знака. Фестывальны сцяг уяўляе сабой палотнішча белага колеру са шматколерным фестывальным знакам у цэнтры.

Міжнародныя фестывалі дзіцячай творчасці “Залатая пчолка” (г. Магілёў). Перадумовы стварэння фестываля. Праграма фестываля, умовы конкурсаў.

**Пытанні длясамаправеркі:**

1. Як вы разумееце ролю музычных і творчых фестываляў, свят і конкурсаў  на сучасным этапе.
2. Што з’яўзляецца галоўнай мэтай штогадовага міжнароднага музычнага фестываля “Еўрабачанне”.
3. Які слоган пра мастацтва стаў дэвіза Міжнароднага фестываля мастацтваў “Славянскі базар ў Віцебску”.

**Літаратура:**


Государственная программа «Культура Беларуси» на 2021 – 2025 годы.

Кодекс Республики Беларусь о культуре от 20 июля 2016 года № 413-З.

*Махлина,* С. Т. Семиотика культуры повседневности : учеб. для студентов высших учебных заведений, обучающихся по гуманитарным направлениям / С. Т. Тевельевна. - 2-е изд., доп. - Москва : Юрайт, 2020. – 253.

*Монина,* Н. П. История и теория праздничной культуры [Электронный ресурс] : учеб. пособие : в 6 частях [16+] / Н. П. Монина ; Омский государственный университет им. Ф. М. Достоевского. – Омск : Омский государственный университет им. Ф.М. Достоевского (ОмГУ), 2019. – Часть 6. История праздничной культуры России Нового и Новейшего времени. – 220 с. – Режим Доступа: https://biblioclub.ru/index.php?page=book&id=575856


***Тэма 7. Міжнародныя і рэспубліканскія фестывалі Рэспублікі Беларусь***

Сучасныя традыцыйныя міжнародныя і рэспубліканскія фестывалі Беларусі.Дзень беларускай пісьменнасці.

Рэспубліканскае свята-кірмаш “Дажынкі”.

Брэсцкай вобласць: міжнародны кулінарны фестываль «Мотальскія прысмакі» (а.г. Моталь);міжнародны фестываль духавой музыкі "Беларускія фанфары" (г. Баранавічы);Фестываль “Ружанская брама” (г. Ружаны); Фестываль “Камянецкая вежа” (г. Камянец);

Віцебская вобласць: фестываль “SPRAVA” (Чашніцкі раён), “Вішнёвы фэст” (г. Глубокае), фестываль міфалогіі «У госці да Лепельскага Цмока»; экалагічнае свята Жураўлі і журавіны Міёрскага краю»;

Гомельская вобласць: міжнародны фестываль харэаграфічнага мастацтва «Сожскі карагод»; рэспубліканскі ўсебеларускі фестываль народнага гумару «Аўцюкі» (Калінкавічскі раён); рэспубліканскі фестываль этнакультурных традыцый “Зоў Палесся” (а.г. Ляскавічы);

Гродзенская вобласць: Рэспубліканскі фестываль нацыянальных культур; фестываль “LidBeer” (г. Ліда); “Ганненскі кірмаш у Зэльве”; міжнародны байк-фестываль "Хавайся ў бульбу" (г. Гродна); міжнародны фестываль воднага турызму "Нёманская весна" (Аўгустоўскі канал);

Мінская вобласць: “А-фэст” (Лошыцкі парк, г. Мінск); “Свята сонца”, “Наш Грюнвальд” (этна-музей “Дудуткі”), “#ПРОНЕБО” (в. Баравая);Свята мастацтваў “Музы Нясвіжа”;Нацыянальны фестываль беларускай песні і паэзіі "Маладзечна" (Маладзечна, п. Чысць);Музычныя праекты “Класіка ля Ратушы” і “Джазавыя вечары ля мінскай Ратушы”; Міжнародны фестываль “Шлях вікінгаў” (парк-музей інтэрактыўнай гісторыі “Сула”);Мінскі міжнародны кінафестываль «Лістапад»;

Магілёўская вобласць: фестываль сельскага турызму «Гаспадарчы сыр» (г. Слаўгарад);Міжнародны пленэр па кераміцы “Арт-Жыжаль” (г. Бабруйск); Этнасвята “У госці да радзімічаў” (Чавускі раён).

**Пытанні для самаправеркі:**

1. Якія галоўныя міжнародныя і рэспубліканскія фестывалі Рэспублікі Беларусь вы ведаеце.
2. Назавіце галоўныя абласныя фестывалі Рэспублікі Беларусь.

**Літаратура:**


Государственная программа «Культура Беларуси» на 2021 – 2025 годы.

Кодекс Республики Беларусь о культуре от 20 июля 2016 года № 413-З.

*Махлина,* С. Т. Семиотика культуры повседневности : учеб. для студентов высших учебных заведений, обучающихся по гуманитарным направлениям / С. Т. Тевельевна. - 2-е изд., доп. - Москва : Юрайт, 2020. – 253.

*Монина,* Н. П. История и теория праздничной культуры [Электронный ресурс] : учеб. пособие : в 6 частях [16+] / Н. П. Монина ; Омский государственный университет им. Ф. М. Достоевского. – Омск : Омский

государственный университет им. Ф.М. Достоевского (ОмГУ), 2019. – Часть 6. История праздничной культуры России Нового и Новейшего времени. – 220 с. – Режим Доступа: https://biblioclub.ru/index.php?page=book&id=575856

*Фядотаў*, А.Г. Свята беларускага пісьменства ў школе / А.Г. Фядотаў. – Мінск : Беларуская навука, 2000. – 56 с.

### *Тэма 8. Міжнародная акцыя “Ноч музеяў”*

Музей як інавацыйная гульнявая пляцоўка. Музей “блізкі і далёкі” – сацыяльная і псіхалагічная умова для міжнароднай акцыі “Ноч музеяў”. Міжнародны дзень музеяў (1977). Міжнародная акцыя “Ноч музеяў” - актуальныя тэндэнцыі ў мастацтве, папулярызацыя мастацтва, паказ рэсурсаў, магчымасцей, патэнцыялу музеяў, прыцягненне ўвагі.

18 траўня ва ўсім свеце адзначаюць Міжнародны дзень музеяў. Гэты дзень святкуецца з 1977 года, калі XI генеральная канферэнцыя ICOM (International Council of Museums — Міжнародны савет музеяў), якая праходзіла ў Маскве і Ленінградзе, прыняла рашэнне па прапанове савецкай дэлегацыі аб усталяванні штогадовага прафесійнага свята. Напярэдадні гэтага дня ў многіх краінах свету праходзіць міжнародная акцыя «Ноч музеяў», асноўная мэта якой — папулярызаваць мастацтва, паказаць рэсурс, магчымасці, патэнцыял сучасных музеяў, прыцягнуць увагу моладзі.Гэта не наўпрост паказ гістарычных, археалагічных або жывапісных калекцый, часам адмыслова падрыхтаваных для музейнай ночы, але гэта і своеасаблівая тэатральная, забаўляльная і культурная дзея. Выключныя эфекты, уласцівыя начному асвятленню, надаюць новае аблічча добра вядомым зборам музеяў, ператвараючы іх агляд у займальнае і захапляльнае дзеянне.“Ноч музеяў” — гэта ўнікальная магчымасць па-новаму зірнуць на музейную справу, зазірнуць у выставачныя залы ў незвычайны час, адсачыць актуальныя тэндэнцыі ў мастацтве, дакрануцца да помнікаў гісторыі і культуры.Адкрытасць для гледачоў — асноўны дэвіз «музейнай ночы» усяго свету. Таму ў шматлікіх музеях захавальнікі скарбаў адкрываюць свае засекі і дазваляюць зірнуць на музейныя каштоўнасці, якіх няма ў экспазіцыйных залах.Акрамя традыцыйных экспазіцый і выстаў, яны да таго ж у большасці імкнуцца падрыхтаваць да фестывалю спецыяльную праграму: аўтарскія экскурсіі, лекцыі, майстар-класы, гістарычныя рэканструкцыі, інсталяцыі, кінапаказы, арт-праекты, канцэрты класічнай і джазавай музыкі, тэатралізаваныя шоу, квэсты і многае іншае, чаго не ўбачыць у музеях у звычайныя дні.

Спецыяльныя праграмы: аўтарскія экскурсіі, лекцыі, майстар-класы, гістарычныя рэканструкцыі, інсталяцыі, кінапаказы, арт-праекты, канцэрты класічнай і джазавай музыкі, тэатралізаваныя паказы, квэсты, кірмашы, вогненныя шоў і інш.

Ініцыятар міжнароднай акцыі ў Беларусі – Нацыянальны мастацкі музей (2005). У 2013 годзе больш за 100 музеяў Беларусі далучыліся да еўрапейскай акцыі, прысвечанай святкаванню дня музеяў і ночы музеяў. Калектыў кожнага з музеяў падрыхтаваў сваю арыгінальную праграму, якая адпавядала міжнароднаму дэвізу «Музей, памяць і крэатыў — сацыяльныя змены». У актыўную працу ўключыліся не толькі сталічныя музеі, але і рэгіянальныя.Так, напрыклад Археалагічны музей «Бярэсце» (Валынскае ўмацаванне Брэсцкай крэпасці) і музей гісторыі Брэста ў 2013 годзе адкрывалі музейную ноч прэзентацыяй выстаўкі «Артэфакт Бярэсця», інтэрактыўнымі экспазіцыіямі «рублі сякерай» і «Займальная археалогія». Завершылася свята ў музеі гісторыі горада Брэста інтэрактыўнай экскурсіяй «Габрэйскі Брэст», майстар-класам па сярэднявечным танцам і вогненным шоў.Гродзенскі гісторыка-археалагічны музей у тым жа годзе падрыхтаваў праграму «Усходняя ноч у Новым замку». У праграме былі базар ўсходніх тавараў, праца чайнага дома «Чайкоффский», гісторыка-музычная праграма «Подых Усходу» з удзелам школы ўсходніх танцаў, клуба кунг-фу «Іліцюань», Лігі спартыўных мастацтваў.

Нацыянальны мастацкі музей у тым жа годзе прапанаваў убачыць «Беларускую ноч, або Музей у фантастычных апавяданнях». Гэтая была ноч незвычайная і без традыцыйных этнаграфічных элементаў: музей ператвараўся ў дом Шляхціца Завальні, у залах якога маглі знайсці прытулак і ласкава падзяліцца сваімі апавяданнямі шматлікія "вандроўнікі". У рамках гэтай акцыі праходзіў праект «картопля-АРТ» — летняе кафэ, дзе можна было паспрабаваць незвычайныя беларускія «прысмакі». Таксама было магчыма ўбачыць партрэты князёў Вялікага княства Літоўскага, прывезеныя з Львова і Луцка. Як распавялі арганізатары, наведвальнікі маглі бясплатна наведаць «Беларускую ноч», прыйшоўшы ў незвычайных абутку ці акулярах. Ўсіх наведвальнікаў чакалі сюрпрызы.

Таксама важна адзначыць, што ў беларускім сегменце інтэрнэту з 2017 года дзейнічае сайт nochmuzeev.by, прысвечаны Ночы музеяў, на якім можна пачытаць пра гісторыю гэтага мерапрыемства, а таксама даведацца аб праграмах і асаблівасцях яго правядзення ў розных музеях Беларусі. Кожны музей самастойна прымае рашэнне аб удзеле ў акцыі і фармаце правядзення святочных мерапрыемстваў: афлайн у залах музея або анлайн у лічбавай прасторы.

### Пытанні длясамаправеркі:

1. Які слоган з’яўляецца галоўнай умовай для міжнароднай акцыі “Ноч музеяў”.
2. Назавіце фармат міжнароднай акцыі “Ноч музеяў”.
3. Пералічыце спецыяльныя праграмыміжнароднай акцыі “Ноч музеяў”.
4. Узгадайце тэматыку міжнароднай акцыі “Ноч музеяў” у Беларусі.

### Літаратура:


Государственная программа «Культура Беларуси» на 2021 – 2025 годы.

Кодекс Республики Беларусь о культуре от 20 июля 2016 года № 413-З.

*Махлина,* С. Т. Семиотика культуры повседневности : учеб. для студентов высших учебных заведений, обучающихся по гуманитарным направлениям / С. Т. Тевельевна. - 2-е изд., доп. - Москва : Юрайт, 2020. – 253.

*Монина,* Н. П. История и теория праздничной культуры [Электронный ресурс] : учеб. пособие : в 6 частях [16+] / Н. П. Монина ; Омский государственный университет им. Ф. М. Достоевского. – Омск : Омский государственный университет им. Ф.М. Достоевского (ОмГУ), 2019. – Часть 6. История праздничной культуры России Нового и Новейшего времени. – 220 с. – Режим Доступа: https://biblioclub.ru/index.php?page=book&id=575856


### *Тэма 9.Міжнародная акцыя “Бібліяноч”*

«Бібліяноч» – штогадовая міжнародная сацыяльна-культурная акцыя, прысвечаная чытанню. У гэтую ноч бібліятэкі, кнігарні, літаратурныя музеі і арт-прасторы пашыраюць час і фармат сваёй працы.

Новы фармат працы бібліятэк, кнігарняў, літаратурных музеяў і арт-прасторы. Мэта акцый – паказаць рэсурс, магчымасці, патэнцыял сучасных музеяў і бібліятэк краіны, зацікавіць моладзь для наведвання.Тэматыка акцый.

Папулярызацыя чытання і абуджэнне цікавасці да бібліятэчных экспазіцый. Акцыя ў падтрымку чытання “Бібліяноч” – унікальны прыклад таго, як супольнасць людзей, аб'яднаўшыся, могуць памяняць уяўленне цэлага пакалення аб сваёй рабоце. Бібліятэкі прыдумляюць новыя формы працы з чытачамі, праект адразу ахапіў сотні ўстаноў культуры па ўсёй краіне. Колькасць удзельнікаў з кожным годам расце, што падкрэслівае карыснасць праекту, значнасць для грамадства і папулярнасць сярод

насельніцтва Мэта дадзеных рэкамендацыі – аказанне метадычнай дапамогі бібліятэкарам-арганізатарам акцыі на этапах яе планавання, падрыхтоўкі, рэалізацыі і падвядзення вынікаў. Авалоданне прапанаванай методыкай можа стаць асновай для правядзення падобных мерапрыемстваў, таксама будзе садзейнічаць павышэнню матывацыі бібліятэкараў і карыстальнікаў да ўдзелу ў акцыі.

Неабходна адзначыць, што падобны фармат мерапрыемства, як «Бібліянач», бібліятэкі з вялікім поспехам выкарыстоўваюць ужо некалькі гадоў. Бібліятэкі, ўслед за музеямі, вырашылі пераняць вопыт і сталі арганізоўваць «Ноч», "Вечар у бібліятэцы", "Змрок у бібліятэцы", "Квэст па начной бібліятэцы», арганізовываць спецыяльныя праграмы (экскурсіі ў кнігасховішчы, лекцыі, майстар-класы, выставы, гістарычныя рэканструкцыі, інсталяцыі, кінапаказы, арт-праекты, канцэрты класічнай і джазавай музыкі, тэатралізаваныя паказы, маскарады, квэсты, кірмашы і інш.). 15 жніўня – дзень бібліятэк у Беларусі.

## Пытанні длясамаправеркі:

1. Як называецца міжнародная сацыяльна-культурная акцыя, прысвечаная чытанню.
2. Сфармулюйце мэту акцый “Бібліяноч”.
3. У чым праяўляецца новы фармат працы бібліятэк, кнігарняў, літаратурных музеяў.
4. Пералічыце спецыяльныя праграмы, якія выкарыстоўваюцца ў акцыі “Бібліяноч”.

## Літаратура:

Государственная программа «Культура Беларуси» на 2021 – 2025 годы.

Кодекс Республики Беларусь о культуре от 20 июля 2016 года № 413-З.

*Махлина,* С. Т. Семиотика культуры повседневности : учеб. для студентов высших учебных заведений, обучающихся по гуманитарным направлениям / С. Т. Тевельевна. - 2-е изд., доп. - Москва : Юрайт, 2020. – 253.

*Монина,* Н. П. История и теория праздничной культуры [Электронный ресурс] : учеб. пособие : в 6 частях [16+] / Н. П. Монина ; Омский государственный университет им. Ф. М. Достоевского. – Омск : Омский государственный университет им. Ф.М. Достоевского (ОмГУ), 2019. – Часть

6. История праздничной культуры России Нового и Новейшего времени. – 220 с. – Режим Доступа: https://biblioclub.ru/index.php?page=book&id=575856

### *Тэма 10.Кансалідуючая роля рэспубліканскіх конкурсаў “Жанчына года” і “Сям’я года”*

Сям'я – асноўны элемент грамадства, які заснаваны на шлюбе і сваяцтве яе членаў. Яна з'яўляецца захавальніцай сацыяльна-чалавечых каштоўнасцей, нацыянальных традыцый, культуры і гістарычнай спадчыны пакаленняў. Беларуская этнічная сям'я адрознівалася ўстойлівасцю свайго складу, структуры, традыцый і нацыянальных асаблівасцей. Кожны гістарычны этап накладваў свой адбітак на фармаванне сям'і, яе структуры і функцыі, на ўнутрысямейныя адносіны, а таксама на ўзаемаадносіны сем'яў і родаў. Мэта штогадовага рэспубліканскага конкурса “Сям’я года” – умацавання духоўна-маральных асноў сям’і, адраджэння і прапаганды сямейных каштоўнасцяў і традыцый. У 2012 годзе ў Мінску адбыўся першы рэспубліканскі конкурс "Сям'я года". Арганізатарамі конкурсу выступіла Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Рэспублікі Беларусь пры ўдзеле Міністэрства інфармацыі, Міністэрства культуры, Міністэрства адукацыі, абласных і Мінскага гарадскога выканаўчага камітэтаў. Мэта конкурсу – умацаванне духоўна-маральных асноў сям'і, адраджэнне і прапаганда сямейных каштоўнасцей і традыцый. Асноўныя задачы: павышэнне ролі і прэстыжу сям’і ў жыцці грамадства як ключавога фактару дзяржаўнай дэмаграфічнай палітыкі; захаванне духоўна-маральных каштоўнасцей сям’і; адказнае бацькоўства; адукацыя і выхаванне дзяцей і моладзі ў сістэме традыцыйных сямейных каштоўнасцей, арыентаваных на стабільнасць адносін, нараджэнне і выхаванне дзяцей, здаровы лад жыцця, пераемнасць пакаленняў, паразуменне і ўзаемападтрымку; прыцягненне ўвагі шырокай грамадскасці да сям’і як да важнейшаму сацыяльнаму інстытуту.

Два этапы конкурса: рэгіянальны, рэспубліканскі.

Асноўныя задачы рэспубліканскага конкурсу “Жанчына года”: дэманстрацыя ролі жанчын у сучасным грамадстве, іх укладу ў здароўе нацыі, выхаванне дзяцей, сацыяльна-эканамічнае і гуманітарна-культурнае развіццё краіны; павышэнне сацыяльнага статусу жанчыны і прыцягнуць увагу да грамадскай значнасці ролі жанчыны; актывізацыя ўдзелу жанчын ва ўсіх сферах жыцця грамадства; кансалідацыя намаганняў ГА "БСЖ", іншых грамадскіх аб'яднанняў, арганізацый розных формаў уласнасці ў актывізацыі іх дзейнасці па паляпшэнню становішча жанчын, падтрымцы жаночых

ініцыятыў у розных напрамках дзейнасці.Усяго на конкурсе прадстаўлена сем намінацый, праводзіць конкурс грамадскае аб'яднанне «Беларускі саюз жанчын» — дзеля таго, каб заахвоціць беларусак, якія дабіліся выдатных поспехаў у розных сферах дзейнасці. Асноўная задача конкурсу — паказаць ролю жанчыны ў сучасным грамадстве, у сацыяльна-эканамічным і гуманітарна-культурным развіцці краіны, фарміраванні грамадзянскасці і патрыятызму, здаровай нацыі, у выхаванні дзяцей.

**Пытанні длясамаправеркі:**

1. Назавіце асноўныя задачы рэспубліканскага конкурсу "Жанчына года".
2. Акрэсліце саноўную мэту рэспубліканскага конкурса "Сям'я года".
3. Пакажыце кансалідуючую ролю ГА "БСЖ" у сацыяльна-культурных праектах краіны.

**Літаратура:**


Государственная программа «Культура Беларуси» на 2021 – 2025 годы.

Кодекс Республики Беларусь о культуре от 20 июля 2016 года № 413-З.

*Махлина,* С. Т. Семиотика культуры повседневности : учеб. для студентов высших учебных заведений, обучающихся по гуманитарным направлениям / С. Т. Тевельевна. - 2-е изд., доп. - Москва : Юрайт, 2020. – 253.

*Монина,* Н. П. История и теория праздничной культуры [Электронный ресурс] : учеб. пособие : в 6 частях [16+] / Н. П. Монина ; Омский государственный университет им. Ф. М. Достоевского. – Омск : Омский государственный университет им. Ф.М. Достоевского (ОмГУ), 2019. – Часть 6. История праздничной культуры России Нового и Новейшего времени. – 220 с. – Режим Доступа: https://biblioclub.ru/index.php?page=book&id=575856


## *Тэма 11. Умовы ўзнікнення новых форм святочнай культуры*

На працягу XX стагоддзя і ў пачатку XXI стагоддзі свята значна змяняецца ў параўнанні з кожнай папярэдняй эпохай. Відавочна, што шмат у чым асновай гэтых змен былі сацыякультурнай трансфармацыі (палітычныя, соцыяльныя, эканамічныя прычыны).

Свята і сёння з'яўляецца спосабам фарміравання культурнай ідэнтычнасці. Можна нават выказаць здагадку, што сучаснае пакаленне не менш мае патрэбу ў механізмах калектыўнай ідэнтычнасці, чым грамадства ў папярэднія эпохі. Крызісныя з'явы ў сацыягуманітарнай сферы, якія маюць

месца сёння, абумовілі і новыя культурныя формы. І калі раней за кошт адносін да свята чалавек у асноўным вызначаў сваю прыналежнасць да дзяржавы або да пэўнай рэлігійнай суполкі, то зараз механізмы ідэнтычнасці распаўсюджваюцца і на больш лакальныя фарміравання (рэгіён, горад, прафесія і г. д.; зразумела, пры захаванні і больш маштабнай задачы – падтрымання агульнанацыянальнай або дзяржаўнай ідэнтычнасці).

Незапатрабаванасць ужо існуючых форм святочнай культуры.

Універсуалізацыя і тыпалагізацыя свят і абрадаў.

Навукова-тэхнічныя ўмовы непазбежнасці ўзнікнення новых формаў мастацкіх відовішчаў.

Мультымедыйнае шоу як сінтэз святла, гуку, агню, вады, лазэрнай графікі, відэа і слайд-праекцыі.

**Пытанні длясамаправеркі:**

1. Якія існуюць тэндэнцыя сацыякультурнай трансфармацыі.
2. У чым праяўляецца ўніверсуалізацыя і тыпалагізацыя свят і абрадаў.
3. Якія ўжо існуючыя формы святочнай культуры становяцца незапатрабаванымі.

**Літаратура:**

Государственная программа «Культура Беларуси» на 2021 – 2025 годы.

Кодекс Республики Беларусь о культуре от 20 июля 2016 года № 413-З.

*Махлина,* С. Т. Семиотика культуры повседневности : учеб. для студентов высших учебных заведений, обучающихся по гуманитарным направлениям / С. Т. Тевельевна. - 2-е изд., доп. - Москва : Юрайт, 2020. – 253.

*Монина,* Н. П. История и теория праздничной культуры [Электронный ресурс] : учеб. пособие : в 6 частях [16+] / Н. П. Монина ; Омский государственный университет им. Ф. М. Достоевского. – Омск : Омский государственный университет им. Ф.М. Достоевского (ОмГУ), 2019. – Часть 6. История праздничной культуры России Нового и Новейшего времени. – 220 с. – Режим Доступа: https://biblioclub.ru/index.php?page=book&id=575856

## *Тэма 12. Асноўныя прыёмы арганізацыі сучаснага свята*

Уважлівае вывучэнне і аналіз сучаснай святочнай культуры дапамагае асэнсаваць і выявіць асноўныя тэндэнцыі культурных працэсаў як у нашай краіне, так і за мяжой. «Свята – люстэрка сваёй эпохі. Па святах, якія

ствараюцца народам, можна меркаваць аб палітычным, гістарычным і духоўным жыцці грамадска-эканамічнай фармацыі, вызначыць ідэі, інтарэсы і імкненні самых розных яе сацыяльных пластоў».

Прыёмы выкарыстання патэнцыялу святочнай культуры:

стварэнне гістарычнага фону (інтэр'ер, архітэктурныя формы, ландшафт);

сімволіка і гістарычная міфалогія святаў;

выкананне традыцыйных і стварэнне новых абрадаў;

касцюміраванне удзельнікаў;

традыцыя і імправізацыя, калектыўная імправізацыя;

рытуальныя дзеянні;

рытуальныя атрыбуты;

рытуальнае слова;

каляровая і гукавая сімволіка;

роля забаўляльнай кампаненты ў сучаснай масавай культуры: гульнявыя праграмы, конкурсы, спаборніцтвы.

Значэнне прафесійных арганізатараў і гледачоў. Святочнае афармленне вуліц, плошчаў, будынкаў.

**Пытанні длясамаправеркі:**

1. Якія прыёмы арганізацыі святочнай культурывы засвоілі для выкарыстання падчас асабістай працы.

**Літаратура:**

Государственная программа «Культура Беларуси» на 2021 – 2025 годы.

Кодекс Республики Беларусь о культуре от 20 июля 2016 года № 413-З.

*Махлина,* С. Т. Семиотика культуры повседневности : учеб. для студентов высших учебных заведений, обучающихся по гуманитарным направлениям / С. Т. Тевельевна. - 2-е изд., доп. - Москва : Юрайт, 2020. – 253.

*Монина,* Н. П. История и теория праздничной культуры [Электронный ресурс] : учеб. пособие : в 6 частях [16+] / Н. П. Монина ; Омский государственный университет им. Ф. М. Достоевского. – Омск : Омский государственный университет им. Ф.М. Достоевского (ОмГУ), 2019. – Часть 6. История праздничной культуры России Нового и Новейшего времени. – 220 с. – Режим Доступа: https://biblioclub.ru/index.php?page=book&id=575856

# 3.ПРАКТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ

## 3.1 Тэматыка і метадычныя матэрыялы да семінарскіх заняткаў

**Семінаркія заняткі № 1**

***Сучасныя фальклорныя святы: формы і фармат іх правядзення Дзяржаўныя святы Рэспублікі Беларусь***

**Пытанні для абмеркавання:**

1. Міжнародны фестываль “Александрыя збірае сяброў” (а.г. Александрыя, Шклоўскі раён).
2. Рэспубліканскае свята “Купалле”: умовы, патрабаванні, магчымасці. “Горад майстроў”, “Горад сяброў”, выставы (“Археалагічныя знаходкі Верхняга Падняпроўя»), кірмашы, фэсты ільну, піва, кваса.
3. Сцэнічнае ўвасабленне народнага свята Купалле. Мюзікл. Эстрадна-цыркавое прадстаўленне. Гала-канцэрт.
4. Рэспубліканскі фестываль аўтэнтычнага фальклору “Берагіня” (г.п. Акцябрскі). Асноўныя накірункі правядзення фестывалю. Прэзентацыя-конкурс народных абрадавых і побытавых танцаў. Конкурс калектываў-захавальнікаў рэгіянальных аўтэнтычных песенных традыцый. Узроставыя катэгорыі ўдзельнікаў.
5. Абласны фестываль народнай традыцыйнай культуры Віцебскай вобласці “Вялікая вясельніца”. Формы і фармат правядзення фестывалю. Папулярызацыя рэгіянальных вясельных традыцый. Прэзентацыя вясельных традыцый рускіх старавераў, яўрэяў. Далучэнне да правядзення фестывалю ўсіх устаноў культуры рэгіёну правядзення фестывалю.

**Семінарскія заняткі № 2**

***Тэма 2. Грамадская запатрабаванасць гістарычных і ваенных рэканструкцый на сучасным этапе***

**Пытанні для абмеркавання:**

1. Гістарычная або ваенна-гістарычная рэканструкцыя як відовішча.
2. Працэс аднаўлення матэрыяльнай і духоўнай культуры пэўнай гістарычнай эпохі, рэгіёна, творчы экскурс у гісторыю.
3. Рух гістарычнай рэканструкцыі на сучасным этапе.
4. Задачы ваенна-гістарычных фестываляў і рэканструкцый.

5. Адукацыйная і выхаваўчая кампанент ваенна-гістарычных фестываляў і рэканструкцый.
6. Новы падыход да вывучэння гісторыі.
7. Фармат ваенна-гістарычных фестываляў у Беларусі: “Жывая гісторыя” (“жывы” музей пад адкрытым небам) і ваенна-гістарычная рэканструкцыя (адлюстраванні ваеннага мінулага ў айчыннай і сусветнай гісторыі).
8. Пазнавальная функцыя аднаўлення гістарычныых касцюмаў розных эпох, выкарыстання арыгінальнай ваеннай тэхнікі, піратэхнікі.
9. Роля ваенна-гістарычных клубаў (“Цытадэль”, г. Бабруйск; “Гарнізон”, г. Брэст; “Апошні рубеж”, г. Магілёў; “Салдаты Перамогі”, г. Мінск; “Старая Вежа”, г. Гомель і інш.).
10. Фэсты ваенна-гістарычных клубаў.
11. Гісторыка-культурный комплекс “Лінія Сталіна” - адзін з найбольш грандыёзных фартыфікацыйных ансамбляў на тэрыторыі Беларусі.
12. Фестывалі ваеннай рэканструкцыі “Бярэзіна”, “Баграціён”, “Легендарныя эпохі”; ваенна-гістарычная рэканструкцыя Бабруйскай наступальнай аперацыі “Бабруйскі кацёл” і інш.

**Семінарскія заняткі № 3**

***Тэма 3.Мастацка-спартыўныя відовішчы агульнасусветнага і рэспубліканскага ўзроўню***

**Пытанні для абмеркавання:**

1. Відовішчы і прадстаўленні на стадыёнах.
2. Комплекс разнастайных спартыўных, культурных, мастацка-тэматычных мерапрыемстваў на вялікай тэрыторыі (стадыёны, паркі, вуліцы).
3. Мастацка-спартыўныя мерапрыемствы на вадзе.
4. Традыцыі провадаў і сустрэч беларускіх спартсменаў.
5. Змест і задачы правядзення алімпіяд, паралімпіяд.
6. Еўразійскіх гульняў.
7. Спартакіяды і універсіяды на сучасным этапе.
8. Мінскі паўмарафон.
9. Міжнародны турнір аматараў хакея на прыз Прэзідэнта РБ.
10. Рэспубліканскае спартыўнае свята «Мінская лыжня» і інш.

**Семінарскія заняткі № 4**

***Тэма 4.Роля музычных і творчых фестываляў, свят і конкурсаў на сучасным этапе***

## Пытанні для абмеркавання:

1. Гісторыя ўзнікнення штогадовага міжнароднага музычнага фестываля “Еўрабачанне”. Умовы песеннага конкурсу. Адборачныя туры. Краіны-удзельніцы. Жывы гук. Прамы эфір. Падвядзенне вынікаў. Краіна-пераможца. Музычны кантракт. Дзіцячы міжнародны музычны фестываль “Еўрабачанне”. Умовы песеннага конкурсу для дзяцей.
2. “Праз мастацтва – да міра і ўзаемапаразумення” – дэвіз Міжнароднага фестываля мастацтваў “Славянскі базар ў Віцебску”. Славянскія краіны-заснавальніцы. Праграма фестывалю: міжнародны конкурс маладых выканаўцаў эстраднай песні, міжнародны дзіцячы музычны конкурс; гала-канцэрты майстроў мастацтваў Беларусі, Расіі і Украіны, канцэртныя праграмы «зорак» эстрады, выставы, кірмашы, майстар-класы і інш.
3. Міжнародныя фестывалі дзіцячай творчасці “Залатая пчолка” (г. Магілёў). Перадумовы стварэння фестываля. Праграма фестываля, умовы конкурсаў. Узнагароды.

**Семінарскія заняткі № 5**

***Тэма 5. Міжнародныя і рэспубліканскія фестывалі Рэспублікі Беларусь***

## Пытанні для абмеркавання:

1. Дзень беларускай пісьменнасці.
2. Рэспубліканскае свята-кірмаш “Дажынкі”.
3. *Брэсцкай вобласць*: міжнародны кулінарны фестываль «Мотальскія прысмакі» (а.г. Моталь);міжнародны фестываль духавой музыкі "Беларускія фанфары" (г. Баранавічы);Фестываль “Ружанская брама” (г. Ружаны); Фестываль “Камянецкая вежа” (г. Камянец);
4. *Віцебская вобласць*: фестываль “SPRAVA” (Чашніцкі раён), “Вішнёвы фэст” (г. Глыбокае), фестываль міфалогіі «У госці да Лепельскага Цмока»; экалагічнае свята Жураўлі і журавіны Міёрскага краю»;
5. *Гомельская вобласць*: міжнародны фестываль харэаграфічнага мастацтва «Сожскі карагод»; рэспубліканскі ўсебеларускі фестываль народнага гумару «Аўцюкі» (Калінкавічскі раён); рэспубліканскі фестываль этнакультурных

традыцый “Зоў Палесся” (а.г. Ляскавічы);

6. *Гродзенская вобласць*: Рэспубліканскі фестываль нацыянальных культур; фестываль “LidBeer” (г. Ліда); “Ганненскі кірмаш у Зэльве”; міжнародны байк-фестываль "Хавайся ў бульбу" (г. Гродна); міжнародны фестываль воднага турызму "Нёманская весна" (Аўгустоўскі канал);

7. *Мінская вобласць*: “А-фэст” (Лошыцкі парк, г. Мінск); “Свята сонца”, “Наш Грюнвальд” (этна-музей “Дудуткі”), “#ПРОНЕБО” (в. Баравая);Свята мастацтваў “Музы Нясвіжа”;Нацыянальны фестываль беларускай песні і паэзіі "Маладзечна" (Маладзечна, п. Чысць);Музычныя праекты “Класіка ля Ратушы” і “Джазавыя вечары ля мінскай Ратушы”; Міжнародны фестываль “Шлях вікінгаў” (парк-музей інтэрактыўнай гісторыі “Сула”);Мінскі міжнародны кінафестываль «Лістапад»;

8. *Магілёўская вобласць*: фестываль сельскага турызму «Гаспадарчы сыр» (г. Слаўгарад);Міжнародны пленэр па кераміцы “Арт-Жыжаль” (г. Бабруйск); Этнасвята “У госці да радзімічаў” (Чавускі раён).

**Семінарскія заняткі № 6**

***Тэма 6. Міжнародныя і рэспубліканскія фестывалі Рэспублікі Беларусь***

**Пытанні для абмеркавання:**

1. Музей як інавацыйная гульнявая пляцоўка.
2. Міжнародная акцыя “Ноч музеяў” - актуальныя тэндэнцыі ў мастацтве, папулярызацыя мастацтва, паказ рэсурсаў, магчымасцей, патэнцыялу музеяў, прыцягненне ўвагі.
3. Фармат адкрытасці і бясплатнага наведвання для гледачоў.
4. Спецыяльныя праграмы: аўтарскія экскурсіі, лекцыі, майстар-класы, гістарычныя рэканструкцыі, інсталяцыі, кінапаказы, арт-праекты, канцэрты класічнай і джазавай музыкі, тэатралізаваныя паказы, квэсты, кірмашы, вогненныя шоў і інш.
5. Тэматыка Міжнароднай акцыі “Ноч музеяў” у Беларусі: “Беларуская ноч”, «Артэфакт Бярэсця», «Займальная археалогія», «Габрэйскі Брэст», «Усходняя ноч у Новым замку», «Чайкоффский», «Беларуская ноч, або Музей у фантастычных апавяданнях», “Сустрэчы з Сафіяй Гальшанскай” і інш.

**Семінарскія заняткі № 7**

***Тэма 7. Міжнародная акцыя "Бібліяноч"***

**Пытанні для абмеркавання:**

1. Прафесійнае свята– дзень бібліятэк у Беларусі (15 жніўня).
2. «Бібліяноч» – міжнародная сацыяльна-культурная акцыя, прысвечаная чытанню.
3. Новы фармат працы бібліятэк, кнігарняў, літаратурных музеяў і арт-прасторы.
4. Мэта акцый – паказаць рэсурс, магчымасці, патэнцыял сучасных музеяў і бібліятэк краіны, зацікавіць моладзь для наведвання.
5. Тэматыка акцый.
6. Арганізацыя спецыяльных праграм (экскурсіі ў кнігасховішчы, лекцыі, майстар-класы, выставы, гістарычныя рэканструкцыі, інсталяцыі, кінапаказы, арт-праекты, канцэрты класічнай і джазавай музыкі, тэатралізаваныя паказы, маскарады, квэсты, кірмашы і інш.).

**Семінарскія заняткі № 8**

***Тэма 8. Кансалідуючая роля рэспубліканскіх конкурсаў "Жанчына года" і "Сям'я года"***

**Пытанні для абмеркавання:**

1. Асноўныя задачы рэспубліканскага конкурсу "Жанчына года"
2. Павышэнне сацыяльнага статусу жанчыны і прыцягненне ўвагі да грамадскай значнасці ролі жанчыны;
3. Кансалідуючая роля ГА "БСЖ" у сацыя-культурных праектах краіны.
4. Мэта рэспубліканскага конкурса "Сям'я года".
5. Асноўныя задачы конкурса "Сям'я года".

**Спіс літаратуры, якая прапануецца семінарскіх заняткаў:**

*Асноўная*

*Котович,* О. В. Сакральный мир традиции. 99 уроков народной культуры / О. Котович, Я. Крук. – Минск : Адукацыя і выхаванне, 2018. – 578 с.

Кодекс Республики Беларусь о культуре от 20 июля 2016 года № 413-З.

*Махлина,* С. Т. Семиотика культуры повседневности : учеб. для студентов высших учебных заведений, обучающихся по гуманитарным направлениям / С. Т. Тевельевна. - 2-е изд., доп. - Москва : Юрайт, 2020. – 253.

*Монина,* Н. П. История и теория праздничной культуры [Электронный ресурс] : учеб. пособие : в 6 частях [16+] / Н. П. Монина ; Омский государственный университет им. Ф. М. Достоевского. – Омск : Омский государственный университет им. Ф.М. Достоевского (ОмГУ), 2019. – Часть 6. История праздничной культуры России Нового и Новейшего времени. – 220 с. – Режим lоступа: https://biblioclub.ru/index.php?page=book&id=575856

*Дадатковая*

Беларусы : у 12 т. / НАН Беларусі,Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы. – Мінск : Беларус. навука. – Т. 5 : Сям'я / В.К. Бандарчык [і інш.]. – 2001. – 375 с.

Беларусы : у 12 т. / НАН Беларусі,Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы. – Мінск : Беларус. навука. – Т. 6 : Грамадскія традыцыі / В. Ф. Бацяеў [і інш.]. – 2002. – 606 с.

Беларуская вуснапаэтычная творчасць: падруч. для студэнтаў філал. спец. ВНУ / К.П. Кабашнікаў [і інш.]. – 2-е выд., перапрац. – Мінск: Лексіс, 2000. – 512 с.

Беларуская міфалогія : энцыкл. слоўнік / рэдкал.: С. Санько (гал. рэд.) [і інш.] ; склад. І. Клімковіч. – 2-е выд., дап. – Мінск : Беларусь, 2006. – 599 с.

Беларускі фальклор: хрэстаматыя / склад. К.П. Кабашнікаў [і інш.]. – Мінск: Вышэйшая школа, 1985. – 749 с.

Беларускі фальклор: энцыклапедыя: у 2 т. / рэдкал.: Г.П.Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: БелЭН, 2005–2006.

Беларусы: Т. 7: Вусная паэтычная творчасць / НАНБ; Г. А. Барташэвіч, [і інш.]; рэдкал.: В.М. Бялявіна[і інш.]. – 2004. – 586 с.

Беларускі народны каляндар/ аўт.-уклад. А. Ю. Лозка. – Мінск : Полымя, 1992. – 205 с.

*Валодзіна, Т.В.* Семантыка рэчаў ў духоўнай спадчыне беларусаў / Т.В. Валодзіна. – Мінск, 1999. –160 с.

Государственная программа ”Культура Беларуси“ на 2021 – 2025 годы.

*Грамадскі* быт і культура сельскага насельніцтва Беларусі / В.К. Бандарчык [і інш.]. – Мінск : Навука і тэхніка, 1993. – 256 с.

Гульні, забавы, ігрышчы / рэдкал.: А.С.Фядосік [і інш.]. – Мінск : Беларус. навука, 1996. – 534 с.

*Гуд, П. А.* Ад Каляд да Пакроваў / П. А. Гуд ; рэд.-склад. Л. І. Жук. – Мінск : Красіка-Прынт, 2000. – 223 с. – (Беларусь святочная).

*Гуд, П. А.* Беларускі купальскі комплекс і семантыка абрадавых дзей / П. А. Гуд. – Мінск : Тэхнапрынт, 1999. – 221 с.

*Гуд, П. А.* Беларускі кірмаш / П. А. Гуд, Н. І. Гуд. – Мінск : Полымя, 1996. – 268 с.

Жыццяадвечны лад. Беларускія народныя прыкметы і павер'і / уклад., прадм. і пер. У. Васілевіча. – Мінск : Мастац. літ., 1998. – Кн. 2. – 607 с.

Земляробчы каляндар: абрады і звычаі / Акад. навук БССР, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору; [рэд. кал.: В. К. Бандарчык, К. П. Кабашнікаў, А. С. Фядосік (гал. рэд.) ; уклад., класіфікацыя, сіст. матэрыялаў і камент. А. І. Гурскага; уступ. арт. А. І. Гурскага, А. С. Ліса]. – Мінск : Навука і тэхніка, 1990. – 405 с.

Зямля стаіць пасярод свету… / уклад., прадм., пераклад, бібл. У. Васілевіча. – Мінск : Маст. літ., 1996. – 591 с. – (Беларускія народныя прыкметы і павер'і ; кн. 1.)

Зямная дарога ў вырай/ уклад., прадм., пер. У. Васілевіча. – Мінск : Маст. літ., 1999. – 654 с. – (Беларускія народныя прыкметы і павер'і ; кн. 3.)

Каляндарна-абрадавая паэзія / А. С. Ліс, А. І. Гурскі, В. М. Шарая, У. М. Сівіцкі ; Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы ; навук. рэд.А. С. Фядосік. – Мінск : Беларус. навука, 2001. – 515 с.

*Катовіч, А.* Веснавыя святы : навук.-папуляр. выд. : у 2 кн. / А. Катовіч, Я. Крук.– Мінск : Мастац. літ., 2005. – Кн. 1. – 359 с.

*Катовіч, А.* Веснавыя святы : навук.-папуляр. выд. : у 2 кн. / А. Катовіч, Я. Крук.– Мінск : Мастац. літ., 2005. – Кн. 2. – 413 с.

*Катовіч, А.* Зімовыя святы : навук.-папуляр. выд. / А. Катовіч, Я. Крук. – Мінск : Мастац. літ., 2004. – 119 с.

*Катовіч, А.* Летнія святы : навук. выд. : у 2 кн. / А. Катовіч, Я. Крук.– Мінск : Адукацыя і выхаванне, 2009. – Кн. 1. – 368 с.

*Катовіч,* А. В. Мікольская "Свяча" – феномен абрадавай практыкі беларусаў (в. Чарапы Шклоўскага раёна Магілёўскай вобласці) / Аксана Катовіч, Янка Крук. – Мінск : Інбелкульт, 2013. – 93 с.

*Котович, О. В.* Белорусская свадьба в пространстве традиционной культуры / О. Котович, Я. Крук. – Минск : Адукацыя і выхаванне, 2012. – 848 с.

*Крук,* І. І. Следам за сонцам: Бел.нар.каляндар: Дапаможнік для педагогаў дзіцячых дашк. устаноў / І.І. Крук. – Мінск : Ураджай, 1998. – 216 с.

*Крук, Я.* Сімволіка беларускай народнай культуры : навук. выд. / Я. Крук. – Мінск : Беларусь, 2011. – 430 с.

*Кухаронак,* Т. Маскі ў каляндарнай абраднасці беларусаў / Т. Кухаронак. – Мінск : Ураджай, 2001. – 238 с.

*Лозка,* А. Беларуская батлейка. Каляндарныя і абрадавыя гульні / А. Лозка. – Мінск : Тэхналогія, 1997. – 183 с.

*Мальдзіс*, А. І. Беларусь у люстэрку мемуарнай літаратуры XVIII стагоддзя: Нарысы быту і звычаяў / А.І. Мальдзіс. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1982. – 256 с.

Міфалогія беларусаў : энцыкл. слоўн. / склад.: І. Клімковіч, В. Аўтушка; навук. рэд. : Т. Валодзіна, С. Санько. – Мінск : Беларусь, 2011. – 607 с.

Народны тэатр / уклад. М.А. Каладзінскі. – Мінск: Беларус. навука, 2004. – 554с.

Народная культура Беларусі: энцыкл. даведнік / рэд. В.С. Цітоў. – Мінск : БелЭН, 2002. – 431 с.

*Сержпутоўскі,* А. К. Прымхі і забабоны беларусаў-палешукоў / А. К. Сержпутоўскі. – Мінск : Універсітэцкае, 1998. – 302 с.

Традыцыйная мастацкая культура беларусаў: у 6 т. / Т. Б. Варфаламеева, В. І. Басько, М. А. Козенка [і інш.]. – Мінск : Беларуская навука, 2001–2010. – Т. 1 : Магілёўскае Падняпроўе, 2001. – 797 с.

Традыцыйная мастацкая культура беларусаў: у 6 т. / Т. Б. Варфаламеева, А. М. Боганева, М. А. Козенка [і інш.]. – Мінск : Беларуская навука, 2001 – 2010. – Т. 2 : Віцебскае Падзвінне, 2004. – 910 с.

Традыцыйная мастацкая культура беларусаў: у 6 т. / аўт. ідэі Т.Б. Варфаламеева; агул. рэд. Т. Б. Варфаламеева. – Т. 3: Гродзенскае Панямонне. У 2 кн. Кн. 1 / В. І. Басько [і інш.]. – Мінск : Выш. шк., 2006. – 608 с.

Традыцыйная мастацкая культура беларусаў: у 6 т. / аўт. ідэі Т.Б. Варфаламеева; агул. рэд. Т. Б. Варфаламеева. – Т. 3: Гродзенскае Панямонне. У 2 кн. Кн. 2 / А. М. Боганева [і інш.]. – Мінск : Выш. шк., 2006. – 736 с.

